

КІЕЎ У ЖЫЦЦІ КАРАТКЕВІЧА

8–9

«Я ПАВЯДУ ЦЯБЕ Ў МУЗЕЙ...» НОВЫ

12



Выдаецца з 9 чэрвеня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

24 ЛІСТАПАДА 2020 г. АЎТОРАК № 229 (29343)

**ЦЫТАТА ДНЯ**



**Ігар КАРПЕНКА, міністр адукацыі:**

*«Міністэрствам адукацыі сумесна з Міністэрствам аховы здароўя і мясцовымі органамі выканаўчай улады на пастаяннай аснове праводзіцца маніторынг арганізацыі харчавання ва ўстановах адукацыі. Аднак нядаўні выпадак, калі вучні сталічнай сярэдняй школы № 61 трапілі ў бальніцу з сімптомамі атручвання, кажа пра неабходнасць узмацнення работы, якая праводзіцца нават у адносінах да самых нязначных недахопаў у арганізацыі харчавання».*

# ДЫНАСТЫЯ МАЙСТРОЎ



У вёсцы Стрэнькі Рагачоўскага раёна ўжо шаснаццаць гадоў плённа працуе раённы цэнтр рамёстваў — дзеля адраджэння і развіцця народных промыслаў і дэкаратыўнага мастацтва Падняпроўя. Сярод самабытных майстроў установы вылучаецца дынастыя ТКАЧОВЫХ — сямейная пара Ігар і Вольга і іхні малодшы сын Арцём *(на фота)*. Ігар Рыгоравіч — вядомы ў раёне майстар разьбы па дрэве, Вольга Дзмітрыеўна займаецца інкрустацыяй з саломы, аплікацыяй, саломапляценнем, сумяшчае сваю творчасць з пасадай кіраўніка згаданага цэнтра. А Ткачоў-малодшы працягвае традыцыі самага старажытнага рамяства — ганчарства. Арцём нядаўна скончыў Мінскі ўніверсітэт культуры і мастацтва, асвоіў азы і можа лёгка працаваць і з саломай, і з дрэвам, а таксама тчэ ручнікі на кроснах. Аднак свае творчае пакліканне малады майстар бачыць менавіта ў кераміцы.

**Анатоль КЛЯШЧУК, фота аўтара.**

КОРАТКА

- **Рэспубліканскі цэнтр патрыятычнага выхавання моладзі з'явіцца на базе Брэсцкай крэпасці.**
- НББ прадставіць рукапісы і рэдкія кнігі з асабістай калекцыі Уладзіміра Караткевіча.
- **Да канца бягучага года на паляпшэнне жыллёвых умоў накіруюць 1,6 тыс. сталічных шматдзетных сем'яў.**
- Прыпыненне рэйсаў «Белавія» ва ўсе пункты Расіі, акрамя Дамадзедава, прадугледжана да 24 снежня.
- **Педыятрычнае аддзяленне адкрыюць у лячэбна-дыягнастычным корпусе ў Заходнім мікрараёне Пінска.**
- Унікальны выдавецкі праект «Энцыклапедыя падатковай адукаванасці» прэзентавалі ў Мінску.



Падрыхтоўка да свята

# ДЗІЦЯЧАЯ БІБЛІЯТЭКА І АЛЕЯ ГАРАДОЎ

**Што яшчэ з'явіцца да Дня беларускага пісьменства ў Капылі**

**Штогод у першую нядзелю верасня адзначаецца нацыянальнае свята — Дзень беларускага пісьменства, якое для ўсіх нас мае вялікае значэнне. Як правіла, гэтае свята праводзіцца ў гарадах з багатай гістарычнай і культурнай спадчынай, старадаўніх цэнтрах асветы і кнігадрукавання. Нагадаю, што свята тройчы прымаў Полацк (1994, 2003, 2017), двойчы — Тураў (1995, 2004), а таксама Заслаўе (2000, 2014); Навагрудак (1996), Нясвіж (1997), Орша (1998), Пінск (1999), Мір (2002), Камянец (2005), Паставы (2006), Барысаў (2008), Смаргонь (2009), Хойнікі (2010), Ганцавічы (2011), Глыбокае (2012), Шчучын (2015), Рагачоў (2016), Іванава (2018), Слонім (2019), Бялынічы (2020).**

СТАР. 5

Эканоміка і эканомія

# Прадукты для эфектыўнай энергіі:

аксіяльны ветрагенератар, анодныя заземляльнікі, керамзітапенабетон, паліўныя брыкеты



Вопытны ўзор аксіяльнага ветрагенератара на пастаянных магнітах.

СТАР. 4

ISSN 1990 - 763X

З першых вуснаў

# «У патрыятычным выхаванні ў нас вялікі прабел, яго трэба ліквідаваць»

**Прэзідэнт Аляксандр Лукашэнка паставіў задачу ліквідаваць прабел у патрыятычным выхаванні. На гэта ён звярнуў увагу падчас даклада міністра абароны Віктара Хрэніна.**

Па словах кіраўніка краіны, адзін з недахопаў у грамадстве ў гэты час — адсутнасць сапраўднага патрыятызму, асабліва ў мужчын. «Гэта перадусім у тых, па студэнтах бачым, хто не прайшоў службу ва Узброеных Сілах, хто не пакаштаваў гэтага хлеба. Ёсць і сярод тых, што прайшлі. Але іх адзінкі. Таму ў патрыятычным выхаванні ў нас вялікі прабел, яго трэба ліквідаваць», — дадаў Прэзідэнт і спытаў, якім чынам міністр мяркуе вырашаць праблему.

Кіраўнік краіны заўважыў, што апошнім часам Узброеныя Сілы Беларусі прайшлі сур'ёзны этап — прыйшлося падымаць часці, адмабілізоўваць, выкарыстоўваць іх на найбольш небяспечных кірунках.

«Пасля ўсіх нашых мерапрыемстваў і цяпер пасля звальнення ў запас і прызыву на тэрміновую ваенную службу, які стан Узброеных Сіл і якія асноўныя праблемы ва Узброеных Сілах? Другая тэма, мы гэта не хаваем, — супрацьдзеянне дэструктыўным сілам, якія спрабуюць расхістаць краіну і не проста расхістаць, а разбурыць яе», — падкрэсліў Аляксандр Лукашэнка.

Як адзначыў Прэзідэнт, у свеце ўсё больш напружаных пунктаў, таму ўзрастае запатрабаванасць у міратворчых аперацыях. Беларускія вайскоўцы з'яўляюцца ўдзельнікамі міратворчых місій Арганізацыі Аб'яднаных Нацый.

«Мы былі ў свой час у Віцебску, глядзелі дзеянні нашай міратворчай роты. У нас створана рота. Якая тут сітуацыя? — пацікавіўся Аляксандр Лукашэнка. — Дзе нам прыйдзецца ў якасці міратворцаў удзельнічаць па лініі місіі ААН, які тут стан маральны, тэхнічны і фінансавы, бо гэта пэўныя затраты? ААН іх кампенсуе. Але тым не менш, галоўнае — маральны стан Узброеных Сіл і хлопцаў, якія заклікаваны ўдзельнічаць у міратворчых місіях».

Прэзідэнт пацікавіўся і фінансавым пытаннем ва Узброеных Сілах напярэдадні новага года.

**Марыя ДАДАЛКА.**

❍ **У ТЭМУ**

### «Узброеныя Сілы боегатовыя, здольныя выканаць пастаўленыя перад імі задачы»

Пра гэта далажыў кіраўніку краіны і пасля пацвердзіў у размове з журналістамі **міністр абароны Віктар ХРЭНІН.**

Па яго словах, ва Узброеных Сілах скончаны перыяд навучання 2019—2020 гадоў. З 1 снежня 2020 года прыступаюць да новага перыяду навучання. Усе мерапрыемствы, як дадаў міністр, што былі запланаваны ў плане падрыхтоўкі мінулага года, выкананыя ў поўным аб'ёме. Па-за планам праведзеныя тры этапы раптоўных праверак боегатоўнасці Узброеных Сіл.

За мінулы год прызваны каля 9000 ваеннаабавязаных для павышэння ўзроўню падрыхтоўкі па ваенна-ўліковай спецыяльнасці і абслугоўванні тэхнікі, узбраення.

«Асабліва адзначыў кіраўнік краіны, што людзі, якія прызываліся з народнай гаспадаркі, з высокім узроўнем разумення адносіліся да дадзеных працэсаў і дастойна выконвалі свае задачы», — сказаў Віктар Хрэнін.

Як паведаміў міністр абароны, сёння беларускія вайскоўцы ўдзельнічаюць у міратворчых місіях у Ліване (пад эгідай ААН) і ва Украіне (пад місіяй АБСЕ).

«Гэтыя пытанні мы плануем развіваць, пашыраць. У нас ёсць падрыхтаванае падраздзяленне для выканання гэтых задач, міратворчая рота ў Віцебску. Яна гатова да выканання задач, — заявіў Віктар Хрэнін. — Мы хочам дадаткова ўвайсці ў місію пад эгідай ААН у Ліване адным нашым узводам».

Міністр абароны расказаў, што прапанаваў Прэзідэнту стварыць рэспубліканскі цэнтр патрыятычнага выхавання Узброеных Сіл на базе Брэсцкай крэпасці.

«Кіраўнік краіны гэту прапанову падтрымаў і мы зараз прыступім да яе дэтальнай прапрацоўкі. Я думаю, у найбліжэйшы час, у наступным годзе ў нас з'явіцца свой цэнтр, дзе мы будзем займацца з моладдзю», — канстатаваў кіраўнік ваеннага ведамства.

Грамадзянская супольнасць

# Больш за 8 тысяч прапаноў па развіцці краіны

**Рабочая група рэспубліканскага аргкамітэта па падрыхтоўцы шостага Усебеларускага народнага сходу прыступіла да абагульнення прапаноў, якія паступаюць у ходзе грамадскага абмеркавання актуальных пытанняў далейшага развіцця краіны. Пра гэта БелТА паведаміў намеснік кіраўніка Адміністрацыі Прэзідэнта, кіраўнік рабочай групы Андрэй КУНЦЭВІЧ.**


Фота БелТА.

Збор і выпрацоўка такіх прапаноў працягваецца ў рамках рэгіянальных дыялогавых пляцовак, грамадскіх прыёмных, дэпутацкіх сустрэч, прамых ліній і прыёмаў грамадзян у мясцовых органах улады.

«Рэгіянальны ўзровень абмеркавання дазваляе ўзнімаць сапраўды надзённыя і важныя для людзей тэмы, дапамагае фарміраваць стратэгічныя прыярытэты на доўгатэрміновую перспектыву. На розных пляцоўках ужо ўнесена больш за восем тысяч прапаноў, якія датычацца як сацыяльна-эканамічнага, так і грамадска-палітычнага развіцця краіны. Больш за палову з іх паступілі ў Палату прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу», — адзначыў Андрэй Кунцэвіч.

Акрамя таго, рабочая група прапанавала далучыцца да гэтай работы і ўнесці свае прапановы ўсім палітычным партыям і вядучым грамадскім аб'яднанням, якія прытрымліваюцца розных палітычных пазіцый. «Мяркую, што разгорнутая кампанія з удзелам шырокага кола экспертаў, спецыялістаў і проста неабыякавых і актыўных грамадзян, дазволіць правесці якасную падрыхтоўку да шостага Усебеларускага сходу і прапанаваць народу тую стратэгію дзяржаўнага будаўніцтва, якая будзе адпавядаць сённяшнім запытам грамадства і забяспечыць далейшае развіццё краіны, умацаванне яе суверэнітэту», — дадаў намеснік кіраўніка Адміністрацыі Прэзідэнта.

## ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

### Урадавыя войскі Эфіопіі акружаюць сталіцу Тыграя



Федэральныя сілы Эфіопіі акружаюць сталіцу штата Тыграй горад Мэкэле. Пра гэта заявіў афіцыйны прадстаўнік урадавай мэтавай групы па надзвычайным становішчы ў штаце Тыграй Рэдван Хусейн. «Войскі знаходзяцца ў працэсе акружэння Мэкэле за 50 кіламетраў ад цэнтра горада», — цытуе яго эфіопскі тэлеканал Fana. Адначасова Рэдван Хусейн паведаміў, што мяцежнікі з Народнага фронту вызвалення Тыграя (НФВТ) у панядзелак чарговы раз правялі ракетную атаку супраць сталіцы суседняга штата Амхара горада Бахр-Дара. Як адзначае паўднёваафрыканская радыёстанцыя SABC, мэтай ракетных удараў была змешчаная пад Бахр-Дарам найбуйнейшая на поўначы Эфіопіі база ВПС. Урад краіны даў у нядзелю кіраўніцтву і атрадам НФВТ 72 гадзіны для таго, каб скласці зброю і спыніць супраціўленне федэральным сілам. Абвяшчаючы аб ультыматуме, прэм'ер-міністр Абій Ахмед падкрэсліў, што «гэта апошні шанц». У выпадку адмовы з боку НФВТ выканаць патрабаванні Адыс-Абебы пачнецца штурм Мэкэле, у тым ліку з дапамогай цяжкага ўзбраення, падкрэсліў ён.

### СААЗ папярэдзіла пра пагрозу трэцяй хвалі каранавіруса ў Еўропе



Спецыяльны пасланнік Сусветнай арганізацыі аховы здароўя (СААЗ) Дэвід Набара папярэдзіў пра небяспеку трэцяй хвалі COVID-19 у Еўропе ў 2021 годзе, паведаміў Badener Tagblatt. Па словах Набары, еўрапейскім краінам не ўдалося прадухіліць другую хвалю каранавіруса пасля таго, як ім удалося ўзяць пад кантроль першую. «Яны прапусцілі магчымасць пабудаваць неабходную інфраструктуру ў летнія месяцы... цяпер у іх другая хваля. Калі яны не пабудуюць неабходную інфраструктуру зараз, у іх будзе трэцяя ў пачатку наступнага года», — лічыць эксперт. Пры гэтым ён заклікаў еўрапейскія ўлады не звяртацца да такой меры, як лакдаўн, за які даводзіцца плаціць «высокую цану». Сітуацыя з каранавірусам у краінах Усходняй Азіі развіваецца лепшым чынам з-за «вельмі выразнай камунікацыі» паміж уладамі і насельніцтвам, адзначыў Набара.

### Улады Гватэмалы лічаць беспарадкі ў краіне спробай дзяржаўнага перавароту



Кіраўніцтва Гватэмалы лічыць справакаваныя ў выніку пратэстаў супраць праекта новага бюджэту беспарадкі спробай дзяржаўнага перавароту. Адпаведная заява апублікавана на сайце ўрада краіны, паведаміла ТАСС. «Акты сістэматычнага гвалту супраць дзяржаўных інстытутаў, сведкамі якіх сталі ўсе гватэмальцы ў апошнія дні, не з'яўляюцца законнымі спосабамі ажыццяўлення свабоды выказвання думак. Наадварот, такія дзеянні з'яўляюцца толькі сродкам, з дапамогай якога групы, што знаходзяцца ў меншасці, імкнуцца ажыццявіць дзяржаўны пераварот», — адзначаецца ў дакуменце. Днямі ў сталіцы краіны прайшла маштабная акцыя пратэсту, якая перарасла ў беспарадкі і сутыкненні з паліцыяй. Нагодай для маніфестацыі стала прыняцце праекта бюджэту на 2021 год. Дакумент, ухвалены раней, прадугледжвае скарачэнне выдаткаў на ахову здароўя і адукацыю, а таксама нарошчванне дзяржаўнага доўгу. Група агрэсіўна настроеных пратэстоўцаў прарвалася да будынка парламента рэспублікі і падпаліла некалькі памяшканняў, аднак з пажарам хутка ўдалося справіцца.

Вышэйшая школа

# Вучоба + навука + прадпрымальніцтва

**У рамках эксперыментальнага праекта «Універсітэт 3.0» у Беларускім дзяржаўным эканамічным універсітэце плануецца стварыць навукова-тэхналагічны парк і цэнтр трансферу тэхналогій. Пра гэта ішла размова на сустрэчы старшыні Дзяржаўнага камітэта па навуцы і тэхналогіях Рэспублікі Беларусь Аляксандра ШУМІЛІНА са студэнтамі і выкладчыкамі БДЭУ. Акрамя таго, да 2023 года ва ўніверсітэце мяркуецца адкрыць тры галіновыя навуковыя лабараторыі, два даследчыя цэнтры і адзін даследчы інстытут.**

«Канцэпцыя «Універсітэт 3.0» — гэта перспектыўны напрамак і трэнд сучаснага развіцця навуковай арганізацыі. Таму важна не толькі навучаць студэнтаў, але і фарміраваць у іх прадпрымальніцкія кампетэнцыі, працаваць над камерцыялізацыяй студэнцкіх распрацовак і прапаноў. Толькі ў такім выпадку ВНУ стане цэнтрам інавацыйнага развіцця», — падкрэсліў Аляксандр Шумілін. Ён таксама адзначыў, што адзін з перспектыўных кірункаў развіцця эканамічнага ўніверсітэта — распрацоўка і апрабацыя інавацыйных бізнес-мадэляў, якія будуць пакладзены ў аснову бізнес-планаў інавацыйных праектаў. У цяперашні час ДКНТ фарміруе Дзяржаўную праграму інавацыйнага развіцця на 2021—2025 гады, у якую будуць уключаны самыя эфектыўныя праекты па стварэнні новых вытворчасцяў, якія маюць вызначальнае значэнне для развіцця нашай краіны.

Для рэалізацыі прадпрымальніцкага патэнцыялу ў БДЭУ створаны навукова-вытворчы лабараторыі і навукова-практычныя цэнтры: Цэнтр макраэканамічных даследаванняў, галіновая лабараторыя актуальных праблем падаткаабкладання і падатковай палітыкі, галіновая лабараторыя антыманапольнага і цанавога рэгулявання ў галіне гандлю, інавацыйны бізнес-інкубатар факультэта эканомікі і менеджменту БДЭУ і шэраг іншых. Акрамя таго, ва ўніверсітэце стварылі факультэт лічбавай эканомікі для падрыхтоўкі спецыялістаў, якія валодаюць перадавымі ведамі ў галіне інфармацыйных тэхналогій і эканомікі.

**Надзея НІКАЛАЕВА.**

Фінансавая палітыка

## У спісе сістэмных банкаў значацца

**Днямі Нацыянальным банкам краіны з мэтай абмежавання рызык банкаў, нябанкаўскіх крэдытна-фінансавых арганізацый, здольных паўплываць на ўстойлівасць функцыянавання банкаўскай сістэмы, вызначаны пералік сістэмна значных банкаў на 2021 год.**

Як паведамляе прэс-служба фінансавага рэгулятара Беларусі, да групы сістэмнай значнасці І аднесены акцыянерныя таварыствы «ААБ Беларусбанк», «Белаграпрамбанк», «Белгазпрамбанк», «БПС-Ашчадбанк», «Пріорбанк», «Банк БелВЭБ» і «Белінвестбанк».

Да групы сістэмнай значнасці ІІ аднесены ЗАТ «Альфа-Банк», «Банк ВТБ» (Беларусь), «МТБанк», ААТ «Банк Дабрабыт», «Парытэтбанк», «БНБ-Банк».

Спецыялісты Нацбанка адзначаюць, што аднясенне банкаў да ліку сістэмна значных здзейснена на падставе агрэгіраванай ацэнкі іх сістэмнай значнасці па такіх паказчыках, як маштаб дзейнасці банка, яго ўзаемазвязанасць з банкамі-рэзідэнтамі, значнасць для эканомікі і ўзаемазвязанасць з нерэзідэнтамі.

**Сяргей КУРКАЧ.**

Ураджай

## Асноўныя пазіцыі — малако і мяса

### Экспарт сельгаспрадукцыі ў студзені—кастрычніку вырас да 4,5 млрд долараў

**Больш чым на 6 % выраслі продажы сельгаспрадукцыі і прадуктаў харчавання за дзесяць месяцаў гэтага года ў параўнанні з аналагічным перыядам 2019 года і склалі амаль 4,5 млрд долараў. Пра гэта паведаміў намеснік міністра сельскай гаспадаркі і харчавання Ігар БРЫЛО.**

Асноўныя пазіцыі — малочная прадукцыя і мясапрадукты — сёлета былі прададзены на суму каля 1,8 млрд долараў (тэмп росту 105,7 % да ўзроўню мінулага года), а таксама мяса і мясапрадукты — на суму каля 740 млн долараў (112 %).

Экспарт прадукцыі раслінаводства склаў у аб'ёме больш за 360 млн долараў. Найбольш экспартна арыентаваная прадукцыя — свежая гародніна (44,5 % ад агульнага аб'ёму экспарту прадукцыі раслінаводства), плады і ягады — каля 30 %, бульба — амаль 8 %, ільновалакно — каля 4 %. Геаграфія экспарту прадукцыі раслінаводства налічвае 39 краін. Найбольш аб'ёмныя пастаўкі традыцыйна прыпадаюць на Расію, Украіну, Малдову, Казахстан і краіны Еўрапейскага Саюза (Германія, Літва, Польшча, Францыя).

Паводле слоў намесніка міністра, геаграфія экспарту айчыннай прадукцыі пашырылася да 105 краін. Засвоены 21 новы рынак. У іх ліку — краіны Азіі (Бангладэш, Бахрэйн, Індыя, М'янма, Шры-Ланка), Афрыкі (Ангола, Гвінея, Джыбуці, Ліберыя, Мадагаскар, Малі, Марока, Нігер, Сьера-Леонэ), Амерыкі і Карыбскага басейна (Беліз, Парагвай, Уругвай), Еўрапейскага Саюза (Кіпр, Люксембург, Фінляндыя, Харватыя).

Доля Расіі ў агульным аб'ёме экспарту беларускага харчавання зменшылася за год адразу на 23 %, але ўсё яшчэ складае львіную долю — больш за 74,5 % (у 2019 годзе — 97,6 %).

Спецыяліст адзначыў, што сёлета ўдалося павялічыць вытворчасць прадуктаў харчавання ў розным асартыменце. Выручка ад рэалізацыі прадукцыі за студзень—кастрычнік вышэй за адпаведны перыяд мінулага года на 15,5 %. Забяспечаны станоўчы фінансавы вынік: рост прыбытку ад рэалізацыі склаў 25,3 %, рэнтабельнасць продажаў склалася на ўзроўні 5,7 % (на 0,4 % вышэй за ўзровень мінулага года).

Ігар Брыло таксама адзначыў, што Кітай разглядаецца намі як досыць перспектыўны і важны рынак. З кожным годам у гэты рэгіён павялічваюцца пастаўкі нашых тавараў. За дзесяць месяцаў мы экспартавалі ў КНР рэкордную колькасць прадукцыі — на суму крыху меншую за 200 млн долараў (рост у 2,3 раза). За апошнія гады сертыфікавана 98 прадпрыемстваў для паставак у Кітай.

**Сяргей КУРКАЧ.**

Надвор'е

## Снег уперамешку з лістотай

### Апошні тыдзень лістапада... Уначы будзе халаднавата, а ўдзень — вільготна

**Апошняя дэкада лістапада пачалася з цёплага надвор'я. Ды потым дождж уперамешку з мокрым снегам, а дзе-нідзе і наяўнасць снежнага покрыва нагадалі нам, што зіма блізка. Паводле апошняй інфармацыі, снег таўшчынёй 1—4 сантыметры ляжыць на паўночным усходзе Віцебскай і Магілёўскай абласцей. Але большую частку гэтага тыдня атлантычныя цыклоны і іх атмасферныя франты разам з аблокамі будуць несці сагрэтыя Гальфстрымам паветраныя масы. У выніку тэмпературны рэжым па-ранейшаму будзе вышэй за кліматычную норму, паведамляюць спецыялісты Рэспубліканскага цэнтра па гідраметэаралогіі, кантролі радыеактыўнага забруджвання і маніторынгу навакольнага асяроддзя Мінпрыроды.**

Сёння ўдзень воблачна з праясненнямі. На большай частцы тэрыторыі краіны пройдуць кароткачасовыя ападкі, у асноўным дождж. Ды і заўтра чакаецца воблачнае надвор'е, пройдуць кароткачасовыя дажджы, уначы па крайнім паўночным усходзе мокры снег, слабы галалёд. Вецер прагназуецца заходні ўмераны. Тэмпература паветра ўначы складзе ад мінус 1 градуса да 5 цяпла, удзень — ад плюс 2 градусаў да 7 цяпла.

А вось у чацвер надвор'е крыху палепшае. У гэты дзень атмасферны ціск вырасце, у шчыльных восеньскіх аблоках з'явяцца праясненні. У многіх раёнах ападкі спыняцца, толькі ўначы месцамі па ўсходзе краіны чакаюцца кароткачасовыя дажджы. У асобных раёнах Беларусі будуць згушчацца туманы. Вецер прагназуецца заходні, паўднёва-заходні ўмераны. Тэмпература паветра ў начныя гадзіны складзе ад мінус 2 градусаў да 5 цяпла, па Брэсцкай вобласці пры праясненнях — да 5 марозу. Удзень будзе 2—7 цяпла.

У пятніцу да нас зноў занясе порцыю вільготнага цёплага паветра з боку Еўропы. Гэта — уплыў чаргавага атлантычнага цыклону. На большай частцы тэрыторыі краіны пройдуць кароткачасовыя ападкі ў выглядзе дажджу і мокрага снегу. Уначы і раніцай у асобных раёнах чакаюцца слабы туман, галалёд, на дарогах месцамі галалёдзіца. Вецер прагназуецца паўднёва-заходні з пераходам на паўночна-заходні ўмераны. Тэмпература паветра ўначы складзе ад мінус 3 да плюс 3 градусаў, удзень — ад нуля да 6 цяпла.

Паводле папярэдніх прагнозаў айчынных сіноптыкаў, у наступных выхадных умовы надвор'я ў нашай краіне стануць фарміраваць больш халодныя паветраныя масы. Вось тады і пасыплецца мокры снег, а часам і белы, пухнаты... Дарэчы, летась мы сапраўднага снегу так і не дачакаліся.

**Сяргей КУРКАЧ.**

А не шкодзь!

## НЕХТА ЛЕС НАРЫХТОЎВАЕ, а хтосьці гатовы яго «проста адвезці»

**У Гомельскай вобласці выявілі адразу некалькі фактаў крадзяжу драўніны. Толькі за два тыдні стала вядома пра тры такія здарэнні. Агульны аб'ём лесапрадукцыі, якую ўдалося вярнуць лясгасам, склаў больш за 65 кубаметраў, паведамляе Дзяржаўная інспекцыя аховы жывёльнага і расліннага свету.**



Прамежкавы лесапрамысловы склад — гэта пляцоўка паблізу дарогі, на якой адбываецца першаснае складаванне нарыхтаванай драўніны, яе апрацоўка, захоўванне і адгрузка. Доступ да прамсклада, як правіла, адкрыты, але і сам працэс крадзяжу ў такіх умовах — як на далоні. Тым не менш знаходзяцца тыя, хто гатовы рызыкнуць кашальком і дзелавой рэпутацыяй.

Так, Жлобінскай міжрайінспекцыі паступіла інфармацыя, што на адным са складоў Рагачоўскага лясгаса пад покрывам цемры нелегальна грузіцца лесавоз з прычэпам. Супрацоўнікі лясгаса папрасілі дапамогі ў затрыманні парушальнікаў. Імі аказаліся двое прадпрымальнікаў з Барысава. Як высветлілі інспектары, затрыманыя ІП і дырэктар ТАА добра ведалі гэтыя мясціны — раней яны аказвалі паслугі Рагачоўскаму лясгасу па нарыхтоўцы драўніны. А цяпер вырашылі «дапамагчы» з яе рэалізацыяй. У іх машыну ўжо было загружана больш за 41 кубаметр сасны, шкода ад крадзяжу склала амаль пяць тысяч рублёў.

Абодвух парушальнікаў змясцілі ў ізалятар часовага ўтрымання, у дачыненні да іх распачата крымінальная справа. Пакараннем за крадзеж, здзейснены групай асоб, можа стаць буйны штраф, папраўчыя работы, арышт, абмежаванне або пазбаўленне волі.

Яшчэ два факты крадзяжу драўніны ў Жлобінскім і Калінкавіцкім раёнах атрымалася ўстанавіць па слядах аўтатранспарту. Першапачаткова падазрэнні выклікалі дакументы на суправаджэнне грузаў. У першым выпадку інспектары спынілі для праверкі трактар. Яго кіроўца паказаў ордар на водпуск дроў, у той час як лесапрадукцыя ў кузаве была значна лепшай якасці. Ды і іншыя даныя ордара не супадалі з рэальнасцю. Папрасілі паказаць месца загрузкі — слядоў ад трактара там не было.

Пасля гэтага кіроўца прызнаўся, што па ўказанні дырэктара фірмы, у якой ён працуе, выкраў каля 8,5 кубаметра драўніны з прамсклада Жлобінскага лясгаса. Цяпер ацэньваецца кошт лесапрадукцыі, у залежнасці ад сумы нанесенай шкоды будзе прынята рашэнне аб прыцягненні абодвух фігурантаў справы да адміністрацыйнай альбо крымінальнай адказнасці.

У Калінкавіцкім раёне інспектары спынілі для праверкі КамАЗ, які перавозіў амаль 16 кубаметраў якаснай сасны. Кіроўца суправаджаў прадпрымальнік з Калінкавіч, куды і накіроўваўся груз. Вось толькі месца яго адпраўкі высветлілася не адразу: кіроўца казаў, што загрузіў лес непадалёк — у Васілевіцкім лясгасе, гаспадар жа грузу сцвярджаў, што драўніна едзе з Добрушскага раёна. Усумніцца ў словах затрыманых прымусілі і суправаджальныя дакументы.

Для ўстанаўлення праўдзівай карціны інспектары праверылі некалькі прамскладоў на тэрыторыі Васілевіцкага лясгаса. У двух месцах на зямлі побач са штабелямі былі выяўлены свежыя сляды пратэктараў, падобныя з шынамі спыненага аўтамабіля. Работнікі лясгаса паведамілі, што драўніну прадпрымальніку і яго фірме не адпускалі. Па факце крадзяжу лесу распачата крымінальная справа, урон ацэнены ў 2,1 тысячы рублёў.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**
**Фота з сайта Дзяржінспекцыі.**

## На ўчастку — амаль 38 тон металалому

**Супрацоўнікі Быхаўскага РАУС агледзелі прысядзібны ўчастак 31-гадовага жыхара вёскі Макранскія хутары і на прыдамовай тэрыторыі выявілі 37 840 кілаграмаў лому чорнага металу.**

Гаспадар участка растлумачыў, што лом належыць яго знаёмаму 42-гадоваму нідзе не працуючаму жыхару вёскі Мокрае. Установлена, што чорны метал апошні збіраў на прылеглых тэрыторыях для наступнай здачы ў пункт прыёму металалому з мэтай атрымання даходу.

Метал на агульную суму больш за 11 300 рублёў канфіскаваны і перададзены на адказнае захоўванне ва УП «Магілёўдругчармет». Праводзіцца праверка.

Грамадзяніну, які незаконна збіраў метал, пагражае прыцягненне да адміністрацыйнай адказнасці па факце ажыццяўлення прадпрымальніцкай дзейнасці без дзяржаўнай рэгістрацыі і спецыяльнага дазволу. Як паведамляе УУС Магілёўскага аблвыканкама, з гэтым артыкулам кодэкса згадаць гаспадаром мужчына знаёмы: раней неаднаразова прыцягваўся па ім да адказнасці.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

Будзь у курсе!

## НА ЯКІЯ ПАРУШЭННІ ВАРТА ЗВЯРТАЦЬ УВАГУ ПАСАЖЫРАМ ТАКСІ

**Як паведамляе Міністэрства транспарту і камунікацый са спасылкай на прэс-службу Транспартнай інспекцыі, адно з самых частых — перавозчыкі не афармляюць аўтамабіль-таксі адпаведным чынам. Так, калі казаць пра ўнутранае афармленне, пасажырам варта ведаць, што інфармацыйная таблічка з тарыфамі павінна знаходзіцца ў салоне на бачным месцы, як і візітная картка са звесткамі пра кіроўцу з яго фатаграфіяй, інфармацыя аб назве, месцы знаходжання і кантактных тэлефонах перавозчыка.**

Таксама таблічка з тарыфамі павінна змяшчаць звесткі аб кошце праезду за адзін кіламетр, за паездку ў дзённы і начны час, тарыф паездкі за межамі горада, а таксама кошт абаніравання, пасадкі, прастою і заказу таксі па тэлефоне. Пасажыр мае права перад пачаткам паездкі атрымаць інфармацыю аб арыенціровачным кошце паслугі.

У інспекцыі адзначаюць, што з пачатку маштабнай праверкі спецыялісты філіяла па Брэсцкай вобласці праверылі больш за 115 аўтамабіляў. Самыя частыя парушэнні — неадпаведнасць вонкавага і ўнутранага афармлення таксі патрабаванням заканадаўства, а таксама работа на лініі з выключаным таксометрам або ўвогуле без яго. У Гомельскай вобласці агледжана больш за 60 аўтамабіляў-таксі. Сярод выяўленых парушэнняў — факты адсутнасці ў кіроўцаў пры сабе дакументаў, наяўнасць якіх прадугледжана заканадаўствам аб транспартнай дзейнасці. Такія парушэнні фіксуюцца і ў Магілёўскім рэгіёне.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

Парады практыкаў

# ВІЛЬГОТНАЯ МАСКА АД COVID-19 НЕ АБАРОНІЦЬ

**У Магілёўскай вобласці прымаюцца ўсе магчымыя меры, каб стрымаць рост каранавіруснай інфекцыі, але па-ранейшаму фіксуецца дастаткова шмат выпадкаў захворвання на вострыя рэспіраторныя вірусныя інфекцыі, у тым ліку «ковід». Гэтае захворванне лічыцца асабліва небяспечным і тут лепш даверыцца прафесіяналам, размяжоўваць, як той казаў, парады ад знаёмых і з інтэрнэту. Вось некалькі карысных рэкамендацый ад намесніка галоўнага ўрача па медыцынскай частцы магілёўскай Цэнтральнай паліклінікі Алы ЛЯХОВІЧ, якія могуць спатрэбіцца кожнаму з нас.**



***— Ала Валянцінаўна, наколькі напружаная сітуацыя на сённяшні дзень і што трэба для таго, каб абараніцца па максімуме?***

— У параўнанні з аналагічным перыядам мінулага года рост зваротаў з нагоды вірусных інфекцый у нашу паліклініку павысіўся на 15—20 %. Улічваючы, што зараз пандэмія, на першы план выходзяць не ВРВІ і ВРЗ, а каранавірусная інфекцыя. Яна небяспечная ўскладненнямі, больш цяжкім цячэннем. Менавіта таму неабходны масачны рэжым. Галоўнае — папярэдзіць распаўсюджванне. Чалавек можа быць ужо хворы, але першыя некалькі дзён непрыемных адчуванняў у яго няма, ён лічыць сябе здаровым і міжволі распаўсюджвае інфекцыю. Трэба гэта прадухіліць.

***— Зараз у месенджарах пашырана інфармацыя, што пры пастаянным нашэнні маскі арганізму не стае кіслароду і кроў згушчаецца. Маўляў, гэтым чалавек наносіць сабе яшчэ большую шкоду.***

— Асноўнае патрабаванне да нашэння маскі — гэта своечасовая яе замена. У кожнай масцы ёсць інструкцыя, дзе агаворваецца, на які тэрмін эксплуатацыі яна разлічана. Ён можа быць ад дзвюх да васьмі гадзін, рэспіратар наогул разлічаны на 12 гадзін нашэння. Насіць маску мэтазгодна ў месцах знаходжання вялікай колькасці людзей і абавязкова пры доглядзе хворага. А калі чалавек на вуліцы, на адкрытай прасторы, неабходнасці ў такой абароне няма. Праблемы ўзнікаюць, калі людзі парушаюць правілы нашэння маскі — не мяняюць яе своечасова, не звяртаюць увагі на тое, што яна становіцца вільготнай. Пры ўсім гэтым яна страчвае свае ўласцівасці. Нават пад даждом, як толькі маска намокла, яе трэба зняць.

***— А што рабіць, калі чалавек знаходзіцца на «бальнічным», яму трэба ісці на прыём, а ў яго трымаецца тэмпература?***

— Калі ў чалавека назіраюцца сімптомы, звязаныя са стратай нюху і смаку, ёсць кашаль, тэмпература 38,5 і вышэй, аддышка, болі ў сэрцы, трэба заставацца дома і выклікаць урача з паліклінікі або, калі ўжо зусім дрэнна, хуткую дапамогу. Ні ў якім разе нельга займацца самалячэннем. Бывае, што людзі некалькі дзён чакаюць, што ўсё само пройдзе, і гэтым толькі пагаршаюць свой стан. Такіх пацыентаў лячыць складаней. Максімальна эфектыўнае лячэнне ў першыя трое сутак.

***— А ў якім выпадку трэба прымаць антыбіётыкі?***

— Тут усё індывідуальна. Ад каранавіруса лячэння няма. З агульнага можна парэкамендаваць частае цёплае піццё і аскарбінавую кіслату — 1000 міліграм у дзень. Калі тэмпература вышэй чым 38 градусаў, трэба прымаць парацэтамол ці ібупрафен, але толькі пры адсутнасці супрацьпаказанняў.

Нэлі ЗІГУЛЯ.

# ПРАДУКТЫ ДЛЯ ЭФЕКТЫЎНАЙ ЭНЕРГІІ

**Пераможцы шостага конкурсу «Лідар энергаэфектыўнасці — 2020» сёлета ўдзельнічалі ў спаборніцтвах анлайн і гэтак жа атрымлівалі віншаванні. Тым не менш створаныя імі прылады цалкам матэрыяльныя і могуць выкарыстоўвацца для павышэння энерга- і рэсурсаэфектыўнасці як у цэлых галінах вытворчасці, так і на асобных падворках. Усяго сярод сёлетніх пераможцаў у шасці намінацыях 25 прадпрыемстваў. Самай запатрабаванай стала «Энергаэфектыўная тэхналогія года», а яшчэ з'явілася новая — «Лічбавая трансфармацыя, аўтаматызацыя, «разумныя» тэхналогіі». Самыя цікавыя вынаходствы мы вырашылі разгледзець больш падрабязна.**

## ДЛЯ ПАДВОРКАЎ, ТУРЫСТАЎ, ДАСЛЕДЧЫКАЎ АРКТЫКІ

Сёлетні конкурс прайшоў дастаткова паспяхова. Было шмат цікавых заявак, якія рэальна прадэманстравалі інавацыйны тэхналагічны патэнцыял краіны ў частцы павышэння энергаэфектыўнасці. А новая намінацыя па лічбавізацыі дазволіла паказаць патэнцыял і айчынных праграмістаў, і тэхнолагаў па ўкараненні лічбавых тэхналогій, у тым ліку ў энергетыку, заўважыў **Андрэй МАЛОЧКА, старшыня экспертнага савета конкурсу, кіраўнік аддзела агульнай энергетыкі.**

Адным з пераможцаў стаў аксіяльны ветрагенератар на пастаянных магнітах, створаны некалькімі пакаленнямі студэнтаў і магістрантаў БНТУ. Доследная мадэль ужо працуе на прыватным падвор'і **Вячаслава ЧАРВІНСКАГА, к. т. н., дацэнта кафедры ЮНЕСКА «Энергазберажэнне і аднаўляльныя крыніцы энергіі» БНТУ**, які расказаў пра вынаходніцтва.

— Мэтай стварэння прылады было яе выкарыстанне ў прыватных домаўладаннях і аўтаномнае выкарыстанне турыстамі, геолагамі і нават даследчыкамі Арктыкі і Антарктыкі. Другая задача — павышэнне энергааддачы шляхам зніжэння стартавага моманту ветрагенератара.

Ужо пры 100-150 абаротах у хвіліну ветракола пачнецца зарадка акумулятара-назапашвальніка на 12В. Пікавая магутнасць да 2 кВт развіваецца пры хуткасці ветру 12 м/с, а работа пачынаецца ад 3 м/с. Доследная прылада на мачце вышынёй шэсць метраў ужо некалькі месяцаў працуе на лецішчы непадалёк ад Мінска. Энергіі, што яна выпрацоўвае, хапае, каб усе выхадныя не карыстацца звычайнай электраэнергіяй.

— Генератар лёгкі, без электраправоду. Ветракола можна поўнасцю спыніць шляхам кароткага замыкання. Пры росце абаротаў (400-800 абаротаў) ветракола напружанне застаецца практычна стабільнае, што дазваляе абысціся без прылад па стабілізацыі напружання, — сказаў вучоны. — Па папярэдніх разліках за год яна здольная выпрацаваць каля 4,5 тысячы кВт•г пры каэфіцыенце выкарыстоўвання ўстаноўленай магутнасці прыкладна 30 %. Тэрмін акупляльнасці прылады — каля 11 месяцаў. Радыус лопасці ветрака — 1,5 метра, так што ён добра ўлоўлівае вецер. Пры гэтым узровень шуму на вялікім ветры каля 70 дБ.

Аналагічныя прылады кітайскай вытворчасці, дарэчы, каштуюць каля 600 долараў. Сабекошт айчыннай — 280 долараў. І стваральнікі ветрагенератара заяўляюць, што беларускі дакладна будзе больш танны. Да таго ж яны гатовыя дапамагчы ўсім зацікаўленым з чарцяжамі і стварэннем такога вынаходніцтва.

## ПАЛІМЕР ЗАМЕСТ РЭЕК

Абараніць падземныя газа- і трубаправоды, падземныя камунікацыі і металічныя збудаванні ад карозіі дапамагае выкарыстанне палімерных анодных зазямляльнікаў замест традыцыйных — са сталёвых рэек, упэўнены **Андрэй КАЛЯДА, начальнік аддзела энергетыкі, тэлемеханікі і абароны падземных газапровадаў ад карозіі УП «Брэстаблгаз»:**

— У класічных зазямляльніках выкарыстоўваліся рэйкі, былыя ў карыстанні, або чыгунныя трубы. Тэрмін іх службы — каля дзесяці гадоў. Пасля мантажу гэтых традыцыйных электродаў у наступныя два гады пачынае стварацца аксідная плёнка, што пагаршае характарыстыкі прылады. Да таго ж падчас эксплуатацыі рэйкі раствараюццца і забруджваюць грунтавыя воды. Адзін электрод важыць 2,5 тоны — уявіце, што трапляе ў ваадносны пласт за дзесяцігоддзе! Таму мы распрацавалі прынцыпова новае рашэнне.

Першы аб'ект, на якім спецыялісты выкарысталі зазямляльнік, зрабілі на вуліцы Першамайскай у Пінску. Акрамя больш якаснага і надзейнага газазабеспячэння насельніцтва, якога ставілі мэтай дасягнуць работнікі «Брэстаблгаза», яны атрымалі прыемны бонус: на газаправодзе з новымі электродамі пачаў расці патэнцыял.

— Каб прывесці да намінальнага значэння, мы пачалі памяншаць магутнасць станцыі. У выніку істотна знізіўся расход электраэнергіі. За год тут зэканомілі каля 1000 кВт•г, — расказаў Андрэй Каляда. — Гарантаваны тэрмін эксплуатацыі палімерных зазямляльнікаў 30 гадоў, і за гэты перыяд не зніжаюцца токавыя характарыстыкі.

З 2007 года ва ўжытку знаходзяцца ўжо 27 такіх электродаў. А ў будучым спецыялісты плануюць замяніць новымі прыладамі старыя зазямляльнікі на прыкладна 800 аб'ектах.

Анодны зазямляльнік знаходзіцца на глыбіні 48 метраў і пасля тэрміну службы не вымаецца з зямлі. Ён потым паступова абрастае грунтам, не раствараецца і не атручвае падземныя воды.

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)


Так з адходаў драўніны атрымліваюццца паліўныя драўняныя брыкеты і пелеты.

## БЛОКІ З КЕРАМЗІТУ ДЛЯ ЖЫЛЛЯ ЭЛІТЫ?

Пошукамі магчымасцяў энергазберажэння ў доме займаюцца вытворцы матэрыялаў. **Аляксандр ДЗЕРВАЕД, намеснік галоўнага інжынера па мадэрнізацыі і тэхнічным маркетынгу, начальнік тэхнічнага аддзела Новалукомльскага завода керамзітавага гравію**, расказаў, як павысіць энергаэфектыўнасць будынкаў у панельным і індустрыяльным домабудаўніцтве за кошт выкарыстання керамзіту:

— Спецыяльна ў межах выканання дзяржпраграмы на 2016—2020 гады распрацоўваліся сценавыя блокі з керамзітапенабетону для будынкаў індустрыяльнага домабудавання. Матэрыял атрымаўся аблегчаны з дастатковымі трываласнымі якасцямі, і мы гатовыя пастаўляць яго на рынак.

Першую закладку выпрабавальных панеляў зрабілі на Ганцавіцкім заводзе БПД, і па першых выніках «у перспектыве прапануецца на стандартным абсталяванні заводаў БПД адліваць аднаслойную панель з керамзітапенабетону з характарыстыкамі, якіх будзе дастаткова, каб выкарыстоўваць панелі без уцяплення», расказаў Аляксандр Дзерваед.

Хоць керамзітабетон даражэйшы, чым звычайны «цяжкі» бетон, ён мае шэраг пераваг, якія ў рэшце рэшт робяць будаўніцтва больш танным. Панель з керамзітабетону, у прыватнасці, можа забяспечыць усе ўмовы па цеплаправоднасці і марозаўстойлівасці, а таксама аблегчыць нагрузку на канструкцыю, лічаць спецыялісты. Мяркуецца, што таўшчынёй панель павінна атрымацца каля 400—500 мм, а па вазе — прыкладна 600—650 кг/м3. Пакуль жа вядуцца выпрабаванні прадукту.

Пры гэтым блокі з керамзітабетону ўжо актыўна выкарыстоўваюць, напрыклад, прыватныя заказчыкі. Яны прымяняліся ў сталіцы і ў некаторых шматпавярховіках, у тым ліку ў элітным жыллі.

## ДРАЎНЯНЫЯ БРЫКЕТЫ СУПРАЦЬ ТАРФЯНЫХ

Зменшыць выкарыстанне торфу і вугалю для шэрагу розных мэт, у прыватнасці, для гарачага водазабеспячэння жылля, можна за кошт паліўных пелет, мяркуе **Ілья ЦЯЦЕРЫН, галоўны інжынер ААТ «Старобінскі ТБЗ».**

Торфабрыкетны завод займаецца перапрацоўкай драўняных адходаў і пастаўкай торфабрыкетаў. Каб пашырыць лінейку прадукцыі, старобінская арганізацыя стала вырабляць паліўныя драўняныя брыкеты.

— На прадпрыемстве адбылася тэхнічная мадэрнізацыя драбільнага абсталявання, у выніку чаго наладжана вытворчасць драўняных паліўных брыкетаў, — расказаў Ілья Цяцерын. — Яны прызначаны для спальвання на ўстаноўках, якія працуюць на цвёрдым паліве пры выпрацоўцы цепла- і электраэнергіі. Брыкеты маюць форму чатырохгранніка шырынёй да 80 мм, да 40 мм у вышыню і даўжынёй да 200 мм. Шчыльнасць прадукцыі ў межах 800-1400 кг/м³.

Гранічна нізкая зольнасць (да 1,5 %) мінімізуе выдаткі на мерапрыемствы па абыходжанні з попелам. Малая вільготнасць (да 10 %) і высокая цеплаправоднасць (найніжэйшая цеплата спальвання складае 4665 кКал/кг, або 19,5 МДж/кг) забяспечваюць драўняным брыкетам значныя перавагі перад тарфянымі, у якіх сярэдняя цеплата спальвання — 14 МДж/кг.

— Эканамічны эфект пры спальванні драўняных брыкетаў дасягаецца дзякуючы іх высокім значэнням цеплатворнасці і шчыльнасці за кошт зніжэння аб'ёму спажывання паліва. Змяншаюцца таксама затраты на экалагічныя мерапрыемствы, бо памяншаецца колькасць шкодных выкідаў у атмасферу, — запэўніў спецыяліст Старобінскага ТБЗ. — Павелічэнне энергаэфектыўнасці абсталявання, імпартазамяшчэнне паліўна-энергетычных рэсурсаў, павелічэнне выкарыстання мясцовых відаў паліва, рацыянальнае выкарыстанне адходаў дрэваапрацоўкі — задачы, якія вырашаюцца праз выкарыстанне паліўных драўняных брыкетаў.

Цяпер на заводзе штомесяц вырабляюць да 3000 тон драўняных паліўных брыкетаў, але збіраюцца павялічыць магутнасці да вырабу 7000 тон. Працуюць таксама над стварэннем драўняных і торфа-драўняных паліўных гранул — пелет дыяметрам 6-8 мм — для бытавога выкарыстання і 14—16 мм — для прамысловага спальвання.

Як бачна, усе распрацоўкі конкурсу традыцыйна скіраваны на павышэнне энергаэфектыўнасці і змяншэнне энергазатрат, а вось прадстаўленыя тут магчымасці і ідэі штогод натхняюць і здзіўляюць нават экспертаў.

Ірына СІДАРОК.
Фота з архіва прадпрыемства.

# «Хутаранцы», рыхтуйце ранцы...

**У Гомелі распачата будаўніцтва ўнікальнай для рэгіёна ўстановы адукацыі. Школа, аналагаў якой не існуе на Гомельшчыне, будзе ўзведзена ў 96-м мікрараёне абласнога цэнтра.**

Летась з просьбай пабудаваць новую школу на «Хутары», пад такой назвай больш вядомы сярод гамяльчан 96-ы мікрараён, мясцовыя жыхары звярнуліся да старшыні аблвыканкама Генадзя Салаўя. Навучальная ўстанова ў гэтым буйным раёне навабудоўляў — сапраўды вельмі неабходны сацыяльны аб'ект. Цяпер значная колькасць дзяцей з «Хутара» вымушана наведваць школы ў іншых раёнах Гомеля, дабірацца на заняткі зручна не ўсім. У самім жа 96-м мікрараёне дзейнічае толькі адна навучальная ўстанова, якая і так перапоўнена.

І вось сёлета, у жніўні, Генадзь Салавей прыехаў на «Хутар» з важнай навіной: новай доўгачаканай школе — быць. Старшыня аблвыканкама заклаў памятны камень на месцы будучага аб'екта і паабяцаў, — праектныя работы па новай школе завершацца ў лістападзе, а яе падмурак будзе закладзены да канца бягучага года. Абяцанне выканана! Але ж для таго, каб распачаць будаўніцтва, прыйшлося таксама правесці шмат работы, якая звычайна застаецца па-за ўвагай.

Перадпраектную дакументацыю выканаў інстытут «Гомельпраект». На пачатку бягучага года заданне на распрацоўку праекта аб'екта атрымаў інстытут «Дзіпражылмаш».

Між тым на гэтым этапе архітэктары сутыкнуліся з пэўнымі праблемамі. Усё звязана з геалогіяй тэрыторыі. Паклады торфу нагадваюць аб тых часах, калі ў гэтым месцы было возера, потым балота. Спецыялісты вырашылі — частку будынка школы паставяць на падмурак на сваях.

Сёння ўсё гатова для будаўніцтва аб'екта. Распачаты падрыхтоўчыя работы. Плануецца, што яны будуць завершаны ў снежні.

**Намеснік генеральнага дырэктара па ідэалагічнай рабоце і сацыяльным развіцці ААТ «Будаўнічы трэст № 14» Дзмітрый МУРАШКА** праводзіў журналістаў на тэрыторыю і расказаў аб тым, што трэба выканаць на аб'екце:





— Праектам узвядзення сярэдняй адукацыйнай школы ў 96-м мікрараёне прадугледжана пабудова трохпавярховага корпуса, які будзе складацца з чатырох блокаў. Заказчык аб'екта — абласное ўпраўленне капітальнага будаўніцтва.

Ужо вядома, што новая установа адукацыі стане самай вялікай у Гомелі. Яе будынак займе плошчу ў 25 тысяч квадратных метраў, а агульная тэрыторыя — тры з паловай гектары. Адначасова навучацца тут змогуць 845 школьнікаў, у тым ліку дзеці з абмежаванымі магчымасцямі — для іх на новым аб'екце забяспечаць безбар'ернае асяроддзе.

Пакуль уявіць, як у рэальнасці будзе выглядаць гэты маштабны праект могуць толькі спецыялісты. Але ўжо зараз можна даведацца аб унутранай арганізацыі кожнага корпуса новай школы.

— У першым запланаваны кабінеты адміністрацыі, настаўніцкая старэйшых класаў, медпункт, пост аховы, бібліятэка з чытальнай залай, кнігасховішча, гардэроб і (увага!) кінафоталабараторыя, — тлумачаць спецыялісты.

Другі корпус адвядуць пад навучальныя класы на 20 чалавек, пакоі адпачынку для першакласнікаў, а таксама пост аховы і гардэроб. Трэці блок — гэта класы, разлічаныя на 25 чалавек, кабінеты інфарматыкі, хіміі, фізікі, а таксама лінгафонныя класы.

Чацвёрты корпус адведзены пад буфет і школьную сталовую з дзвюма заламі на 250 месцаў.

Акрамя таго ў школе пабудуюць два басейны: для навучання плаванню (6,5 метра на 13 метраў) і для спартыўнага плавання (13 метраў на 25 метраў), футбольны стадыён са штучным пакрыццём, пляцоўкі для гульні ў баскетбол, валейбол, міні-футбол і тэніс. Прадугледжаны і спецыяльныя зоны для зарадкі мабільных тэлефонаў.

Будаўніцтва ўстановы адукацыі будзе праходзіць у два этапы. Цяпер актыўна праходзіць падрыхтоўчы. Ужо ўстаноўлена агароджа будаўнічай пляцоўкі, арганізаваны побытавы гарадок для будаўнікоў, вядуцца земляныя работы ў катлаване.

Важным далейшым этапам стане мантаж інжынерных камунікацый: водаправода, каналізацыі, цеплавых і кабельных сетак, электрасувязі. Фінальная фаза падрыхтоўчага этапу — мантаж фундамента — запланавана на снежань, пасля чаго распачнецца працэс будаўніча-мантажных работ: спецыялізаваных, сантэхнічных, апрацоўчых...

Дарэчы, нарматыўны тэрмін узвядзення новай школы ў 96-м мікрараёне — 15 месяцаў. Але прадпрыемства-генпадрадчык не выключае магчымасці скарачэння заяўленага тэрміну здачы, у тым ліку за кошт прыцягнення дадатковых сіл і арганізацыі работы ў тры змены. Пакуль на аб'екце задзейнічана два дзясяткі рабочых. У далейшым будаўнікі будуць працаваць як вахтамі, так і кругласутачна.

Як паведаміў Дзмітрый Мурашка, менавіта гэтая школа стане для будаўнікоў Гомельшчыны ўнікальным аб'ектам і з пункту гледжання архітэктуры, і па шэрагу характарыстык. Важна, што пры будаўніцтве маштабнага сацыяльна значнага аб'екта будуць выкарыстоўваць самыя сучасныя матэрыялы з пазнакай «Зроблена ў Беларусі».

**Наталля КАПРЫЛЕНКА,**
**фота аўтара.**

# ДЗІЦЯЧАЯ БІБЛІЯТЭКА І АЛЕЯ ГАРАДОЎ

***(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)***

Чарговае свята пройдзе ў Капылі ў верасні 2021 года. Дарэчы, тут жа ладзіцца і Мінскі абласны фестываль-кірмаш працаўнікоў сяла «Дажынкі».

Аб тым, што новага з'явіцца ў райцэнтры і як ідзе падрыхтоўка да гэтых знамянальных падзей, карэспандэнт «Звязды» пацікавілася ў **старшыні Капыльскага райвыканкама Сяргея ПІЛІШЧЫКА.**



Фота sb.by

***— Сяргей Міхайлавіч, што значыць для вас і ўсіх капылян Дзень беларускага пісьменства?***

— Прымаць Дзень пісьменства Беларусі — для нас вялікі гонар і пашана. Капыльшчына з'яўляецца радзімай многіх айчынных пісьменнікаў; месцам, дзе прайшло іх дзяцінства, юнацтва, якія тут пачыналі свой творчы шлях. І менавіта атмасфера бацькоўскага дома, школы, што яны заканчвалі, культурная спадчына, самабытнасць і адметнасць іх родных мясцін і сфарміравалі будучых пісьменнікаў. Літаратараў — выхадцаў з Капыльскага раёна — каля 30. Варта аддаць належнае, што Цішка Гартны, Іван Бельскі, Анатоль Астрэйка, Алесь Адамовіч, Кузьма Чорны, Ян Скрыган — гэта зоркі першай велічыні. І самы яркі брыльянт у гэтай кагорце, несумненна, — Кузьма Чорны.

Мы хочам падкрэсліць не толькі значнасць для нашага горада Дня беларускага пісьменства, але і падмацаваць гэта канкрэтнымі справамі. У прыватнасці, будзе створана алея выдатных пісьменнікаў — нашых землякоў: падабрана пляцоўка, ідзе абмеркаванне са спецыялістамі, у якім кантэксце, ракурсе павінна знаходзіцца і выглядаць гэтая алея. Галоўным тут, бясспрэчна, стане помнік Цішку Гартнаму, які быў першым прэм'ер-міністрам незалежнай Беларусі. Гэтым мы хочам падкрэсліць яго ўдзел у літаратурным жыцці краіны і нашага рэгіёна.

***— Ці звярталіся вы да вопыту правядзення аналагічных свят у іншых гарадах краіны? Магчыма, там ёсць нешта вартае пераймання?***

— Вялікая група прадстаўнікоў райвыканкама, адукацыі, культуры, жыллёва-камунальнай гаспадаркі раёна прысутнічала на апошнім свяце ў Бялынічах. Вядома, шмат карыснага ўзялі для сябе. У прыватнасці, нам спадабалася ідэя закладкі алеі гарадоў, якія прымалі ўдзел у Днях беларускага пісьменства. Госці раз'едуцца, але пасаджаныя дрэўцы будуць нагадваць пра іх. Акрамя таго, і пасля свята зялёныя пасадкі будуць надаваць прыгажосці райцэнтру, палепшаць экалогію.

***— Што плануецца па добраўпарадкаванні? Можа, з'явяцца новыя аб'екты?***

— Закончылася рэканструкцыя будынка былога клуба будаўнікоў, падыходзяць да завяршэння ўнутраныя работы. Тут размесціцца раённая дзіцячая бібліятэка, ужо вядзецца фарміраванне кніжных фондаў, ідзе добраўпарадкаванне тэрыторыі. Гэта будзе сучасная ўстанова з укараненнем новых тэхналогій, інтэрнэту, з усім неабходным для арганізацыі літаратурных вечарын, чытанняў, іншых мерапрыемстваў, якія будуць пашыраць кругагляд маленькіх грамадзян, падлеткаў, прывіваць ім любоў да кнігі, прагу да чытання. Нездарма кажуць, што трэба чытаць услых, каб чуць сябе і каб фарміравалася шырокае мысленне, добрае вымаўленне, выпрацоўвалася пісьменная мова.

Як вядома, перад прыездам гасцей кожная гаспадыня робіць у доме генеральную прыборку. А Капыль — наш агульны дом. Не чакаючы 2021 года, мы заасфальтавалі 16 вуліц, сем завулкаў, працягваецца ўладкаванне дваровых тэрыторый, устаноўлена дадатковае абсталяванне на дзвюх дзіцячых пляцоўках, распрацавана праектна-каштарысная дакументацыя па афармленні цэнтральнай часткі горада. У дамах будуць заменены дахі, вокны, праведзена цеплавая рэабілітацыя, з'явяцца новыя бардзюры на вуліцах, тратуары, павялічыцца колькасць гульнявых зон. Выдзяляюцца сродкі на дааснашчэнне школьных стадыёнаў, дзіцячых пляцовак, спартыўных зал, на дадатковае аснашчэнне камп'ютарных класаў, набыццё інтэрнэт-дошак, абнаўленне кухонных блокаў, закупку мэблі. Вялікі рамонт правялі ў Цэнтры культуры, закупілі новую мэблю для глядзельнай залы, сэнсарныя экраны, камп'ютары.

У штаб па падрыхтоўцы свята ўваходзяць спецыялісты райвыканкама, адукацыі, культуры, райспажыўсаюза, прыватных гандлёвых арганізацый. Аб'ектам гандлю, што разгорнуць продаж падчас свята, даведзены планы, у якім гістарычным дызайне, колеравай гаме павінны быць аформлены іх links, крамы.

Горад знаходзіцца на Капыльскай градзе — на ўзвышшы і шматлікіх пагорках, што надае ландшафту адметнасць. Навядзенне парадку на зямлі і добраўпарадкаванне не толькі цэнтра, але і ўсяго горада, прылягаючых тэрыторый зробяць Капыль яшчэ больш прыцягальным, і ён заззяе новымі адценнямі фарбаў.

Хочацца, каб Капыль нароўні з Мірам, Нясвіжам стаў турыстычным цэнтрам. Мяркую, можна развіваць турыстычныя маршруты па слядах жыцця і дзейнасці нашых пісьменнікаў. Тым больш што гасцям будзе дзе спыніцца — адрамантавалі гасцініцу.

***— Сяргей Міхайлавіч, што датычыцца «Дажынак», іх правядзенне таксама невыпадковае? Капыльскі раён стабільна і дынамічна развіваецца. Вам ёсць што паказаць і расказаць калегам з іншых рэгіёнаў Міншчыны, краіны!***

— Капыль сам па сабе горад невялікі. Тут жывуць 10 тысяч чалавек, яшчэ 28 тысяч — у раёне. Раён аграрны, таму што 70 % працуе ў сельскай мясцовасці. Менавіта 70 % раённага валавога ўнутранага прадукту «куецца» на зямлі. У нас няма буйной прамысловасці. Галіна прадстаўлена мясцовымі прадпрыемствамі «Каапрам», масласырзавод, лясгас, ЖКГ.

Капыльская зямля заўсёды давала добрыя ўраджаі. Мы збіраем больш за ўсіх у Мінскай вобласці рапсу, буракоў. Наш край называюць жытніцай Міншчыны. Практычна не было ніводнага года, каб валавы збор зерня быў менш як 100 тысяч тон. Па гэтым паказчыку мы ў лідарах у абласным спаборніцтве. Капыльскі раён паказаў за дзесяць месяцаў гэтага года самы высокі тэмп росту аб'ёмаў вытворчасці.

Актыўна ў нас будуюцца і новыя жывёлагадоўчыя аб'екты. Летась уведзена ў дзеянне шэсць. Сёлета ўжо здадзена і ў стадыі завяршэння сем. У наступным годзе запланавана яшчэ тры жывёлагадоўчыя комплексы.

Я лічу, што наша шчодрая зямля павінна даваць аддачу, карміць людзей. Гэта самае галоўнае для ўлады. Вельмі важна, каб чалавек атрымліваў дастойны заробак для ўтрымання сям'і і жыцця ў дастатку. Калі яго галава не затлумлена бытавымі, сацыяльнымі праблемамі, ён думае аб нечым узнёслым, аб тым, як дома пачытаць кнігу, паглядзець добры фільм.

***— І калі пройдзе фестываль?***

— У наступныя выхадныя верасня пасля правядзення Дня беларускага пісьменства. Такое рашэнне было прынята абласным кіраўніцтвам. І гэта правільна. Горад не трэба рыхтаваць паасобку да двух свят.

**Таццяна ЛАЗОЎСКАЯ.**

Напярэдадні пленума

# ДАПАМАГАЦЬ — ГАЛОЎНАЯ ЗАДАЧА ПРАФСАЮЗА

**Дзейнасць Беларускага прафсаюза работнікаў культуры, інфармацыі, спорту і турызму (далей прафсаюз) разнастайная і шматгранная. Але, бадай, самае галоўнае — абарона працоўных і сацыяльна-эканамічных правоў і інтарэсаў работнікаў. Што ўдалося зрабіць у гэтым кірунку пасля IX з'езда галіновага прафасюза, пойдзе размова на чарговым пленуме, які адбудзецца 26 лістапада. Падрабязнасці расказала старшыня ЦК прафсаюза Тацццяна ФІЛІМОНАВА.**



***— Таццяна Васілеўна, прафсаюзы не маюць права, як дзяржаўныя органы караць штрафамі наймальнікаў, якія дапускаюць парушэнні. Перш за ўсё дзейнасць прававых інспектараў прафсаюза накіравана на тое, каб указаць на недахопы, каб яны былі своечасова ліквідаваны. Ці не так?***

— Бясспрэчна, наша задача — кантроль і яшчэ раз кантроль. Сёлета з першага студзеня да трыццаць першага кастрычніка прававой інспекцыяй працы праведзены грамадскі кантроль у 270 арганізацыях сферы культуры, інфармацыі, спорту і турызму. Па яго выніках выдадзена 52 прадстаўленні, 50 даведак і 169 рэкамендацый. Выяўлена 541 парушэнне, выпраўлена 483 з іх.

За гэты час прававымі і галоўнымі прававымі інспектарамі працы дадзена 1525 кансультацый па прававых пытаннях, 215 на асабістым прыёме, 1194 — па тэлефоне, 112 падчас работы прамых тэлефонных ліній і круглых сталоў, 4 у глабальнай сетцы Інтэрнэт. Праведзена таксама 50 выязных прыёмаў у арганізацыях, установах, на прадпрыемствах рэгіёнаў. Усяго са сваімі праблемамі і пытаннямі звярнуліся да спецыялістаў 80 чалавек.

Акрамя таго, штомесяц праходзяць «гарачыя» лініі. Сюды па кансультацыю звяртаюцца работнікі арганізацый, якія з'яўляюцца членамі нашага прафсаюза.

***— Таццяна Васілеўна, якія пытанні часцей за ўсё хвалююць заяўнікаў?***

— Найбольш частыя — нізкі ўзровень заработнай платы ў арганізацыях галіны культуры, заключэнне, працяг і скасаванне кантрактаў, афармленне працоўных водпускаў. Актуальныя таксама — незахаванне дадатковых гарантый згодна з калектыўным дагаворам і пагадненнямі. Сярод агучаных — праблемы працаўладкавання ў сувязі з аптымізацыяй у працоўных калектывах, а таксама складанасці ў вядзенні ўліку грамадзян, што маюць патрэбу ў паляпшэнні жыллёвых умоў, працоўныя адносіны з асобамі, якія дасягнулі пенсійнага ўзросту, ільготы маладым спецыялістам.

***— Назавіце, калі ласка, канкрэтныя прыклады дапамогі людзям.***

— У Цэнтральны камітэт прафсаюза звярнулася Ксенія Шуша. Ксенія Валер'еўна працавала ў Міністэрстве спорту і турызму спартсменам-інструктарам нацыянальнай каманды Беларусі па тэхвандо ў 1998—2002 гадах. Жанчына прасіла пасадзейнічаць ёй у атрымманні даведкі аб ільготнай пенсіі ад былога наймальніка. Ён абгрунтаваў адмову тым, што яна была прынята на работу па загадзе 4 студзеня 1998 года і 5-гадовы стаж, які патрабуецца, у яе адсутнічае.

Галоўны прававы інспектар працы Ала Ждановіч вывучыла ўсе дакументы кадравай службы пры прыёме на работу жанчыны, падрыхтавала і накіравала ў Міністэрства спорту і турызму пісьмо аб унясенні адпаведнага змянення ў загад аб прыёме яе на работу і выдачы ёй даведкі аб рабоце, якая дае права на пенсію за выслугу гадоў. У выніку былі ўнесены змяненні ў загад і ў працоўную кніжку.

На асабісты прыём да галоўнага прававога інспектара Гомельскай абласной арганізацыі прафсаюза Васіля Дзямчыхіна з пісьмовай заявай звярнуліся супрацоўнікі спецыялізаванай дзіцяча-юнацкай школы алімпійскага рэзерву № 3 па водным пола. Яны паскардзіліся, што не ажыццяўляецца даплата работнікам, якія маюць званне «Заслужаны трэнер Рэспублікі Беларусь» або «Заслужаны майстар спорту Рэспублікі Беларусь». Раней, калі ўстанова адносілася да сістэмы адукацыі, людзі гэтую даплату атрымлівалі. Пры пераходзе ў прафсаюз культуры, інфармацыі, спорту і турызму яна была скасаваная.

Прафсаюзнаму камітэту і наймальніку было прапанавана вывучыць пытанне і ўнесці яго ў калектыўны дагавор. Цяпер супрацоўнікам гэтай катэгорыі выплачваюць даплаты да заробку.

Старшынёй Гродзенскай абласной арганізацыі прафсаюза (галоўным прававым інспектарам працы) Дзянісам Малевічам аказана дапамога ў пераразліку заработнай платы бармену КУП «Дзятлавакінавідэасетка» ў сувязі з няправільным улікам рабочага часу на суму 105 рублёў. Супрацоўніку дзіцячай школы мастацтваў імя Тызенгаўза ў сувязі са знаходжаннем яго на медыцынскім абследаванні па накіраванні ваенкамата вярнулі 135 рублёў.

І такіх прыкладаў станоўчага вырашэння пытання на карысць работнікаў мноства.

***— Таццяна Васілеўна, вельмі важна, калі чалавек мае дах над галавой. Тады і настрой у яго бадзёры і работа спорыцца. Вы агучылі, што грамадзяне звяртаюцца па дапамогу ў гэтым пытанні ў галіновы прафсаюз. І што далей?***

> **«Сярод агучаных — праблемы працаўладкавання ў сувязі з аптымізацыяй у працоўных калектывах, а таксама складанасці ў вядзенні ўліку грамадзян, што маюць патрэбу ў паляпшэнні жыллёвых умоў, працоўныя адносіны з асобамі, якія дасягнулі пенсійнага ўзросту, ільготы маладым спецыялістам».**

— У арганізацыях, што знаходзяцца ў сферы дзейнасці прафсаюза, вядзецца кантроль за ўлікам грамадзян, якія маюць патрэбу ў паляпшэнні жыллёвых умоў у адпаведнасці з заканадаўствам.

Па інфармацыі прафсаюзных арганізацый, за 2019—2020 гады ў паляпшэнні жыллёвых умоў маюць патрэбу 753 чалавекі. Жылыя памяшканні камерцыйнага выкарыстання прадстаўлены 264 работнікам. Тым, хто стаіць на ўліку на паляпшэнне жыллёвых умоў, былі выдзелены 51 зямельны ўчастак для будаўніцтва і абслугоўвання аднакватэрных блочных жылых дамоў, 59 чалавек атрымалі накіраванне на ўзвядзенне жылых памяшканняў у складзе арганізацый-забудоўшчыкаў. Заключаны таксама шэсць дагавораў долевага будаўніцтва з дзяржаўнай падтрымкай, выдзелены пакоі ў інтэрнаце 169 работнікам.

У кастрычніку 2020-га Цэнтральным камітэтам прафсаюза накіравана пісьмо ў Мінгарвыканкам з просьбай пасадзейнічаць у магчымасці прымянення паніжальнага каэфіцыента 0,2 пры разліку арэнднай платы за карыстанне памяшканнямі камерцыйнага прызначэння ў жылым комплексе «Магістр» для работнікаў арганізацый сферы культуры і мастацтва і іншых бюджэтных арганізацый, якія тут пражываюць. На жаль, мы атрымалі адказ, што гэта немагчыма.

***— Відаць, праблемы з жыллём уплываюць на прыцягненне і замацаванне маладых спецыялістаў у сферы культуры?***

— Бясспрэчна, калі ў гарадах можна зняць кватэру або забяспечыць маладога спецыяліста інтэрнатам, то ў сельскай мясцовасці зрабіць гэта цяжка. Як правіла, жыллё не здаецца ў арэнду, інтэрнатаў у вёсцы няма, кампенсацыі за арэнду жылля і праезд адсутнічаюць. Некаторыя маладыя сем'і гатовы застацца працаваць у сельскай мясцовасці пры ўмове выдзялення ім зямельнага ўчастка пад індывідуальнае будаўніцтва. Але ўчасткі не выдзяляюцца, а прадаюцца з аўкцыёну па высокіх цэнах.

У сувязі з тым, што многія суб'екты гаспадарання, дзе створаны пярвічныя арганізацыі прафсаюза не маюць ва ўласнасці жылля, мы рэкамендуем у калектыўныя дагаворы ўключаць нормы, якія абавязваюць наймальніка пры наяўнасці магчымасці кампенсаваць расходы па найме жылля работніку.

Жыллёвыя пытанні пастаянна ў полі зроку прафсаюза.

***— Калектыўны дагавор — гэта, можна сказаць, лакальная канстытуцыя для кожнай прафсаюзнай арганізацыі. Наколькі ведаю, з кожным годам гэты дакумент удасканальваецца.***

— Пытанні калектыўна-дагаворнага рэгулявання знаходзяцца пад пастаянным кантролем прафсаюза. Асаблівая ўвага надаецца таму, каб у дзеючых раённых пагадненнях, калектыўных дагаворах не зніжаліся нормы і гарантыі, устаноўленыя Генеральным пагадненнем паміж урадам Рэспублікі Беларусь, рэспубліканскімі аб'яднаннямі наймальнікаў і прафсаюзаў на 2019—2021 гады. Вынікі выканання калектыўных дагавораў падводзяцца не менш як адзін раз у паўгоддзе на прафсаюзных сходах, на пасяджэннях прафсаюзных камітэтаў пярвічак з удзелам адміністрацый. Аднак аналіз паказаў, што на адзін калектыўны дагавор прыходзіцца 22 нормы Генеральнага пагаднення. Прафсаюзу неабходна яшчэ папрацаваць у гэтым кірунку з тым, каб у сярэднім на адзін калектыўны дагавор прыпадала не менш як 30 нормаў Генпагаднення.

***— Якія прапановы прафсаюза па падтрымцы ўстаноў падчас пандэміі каранавіруса?***

— У сувязі з эпідэміялагічнай сітуацыяй у краіне значна скарацілася, а дзесьці і прыпынена пазабюджэтная дзейнасць. Таму мы прасілі зменшыць або вызваліць ад падаткаабкладання даходы ўстаноў культуры і спорту ад пазабюджэтнай дзейнасці. Хоць бы на перыяд эпідэміялагічнай сітуацыі ў краіне і час выхаду з яе.

**Таццяна ЛАЗОЎСКАЯ.**

Сустрэнемся на фестывалі

# Што чытаць дзецям і падлеткам?

**27 лістапада ў культурным цэнтры «Корпус» (Мінск, праспект Машэрава, 9) пачне сваю работу фестываль падлеткавай і young adult-кніг «Y.A.» («Я»). Ініцыятыва належыць аб'яднанню «Pradmova» і грамадскаму праекту «За Чтение». Сярод партнёраў фестывалю — «Литературный клуб РомашЬка», культурны цэнтр «Корпус», Цэнтр беларускай драматургіі і іншыя.**

З просьбай пракаментаваць праграму фестывалю мы звярнуліся да арганізатараў. Дарэчы, яны падкрэсліваюць, што ўваход будзе вольны. Праўда, на некаторыя мерапрыемствы варта папярэдне запісацца, бо дзеля забеспячэння санітарна-эпідэміялагічнага рэжыму колькасць месцаў абмежаваная.

27 лістапада (пятніца) а 14.30 у зоне А пройдзе лекцыя Мікіты Моніча, прысвечаная гісторыі мастацтва, кнігам пра мастацтва. Нагадаем, што Мікіта Моніч — арыенталіст і экскурсавод і сустрэча з ім абяцае быць на дзіва цікавай. А ў зоне В а 15.00 наведвальнікаў фестывалю чакае інтэрактыўная вікторына на веданне творчасці класіка беларускай літаратуры ад «Вандроўнага фэста Уладзіміра Караткевіча» (16+). У зоне С з 15.00 да 19.00 пройдзе майстар-клас па стварэнні пластылінавага мультфільма па кнізе Л. Леоні «Пецэтына» ад Студыі дзіцячай мультыплікацыі «Энфіс» (12+). Удзельнікі паспрабуюць сябе ў анімацыйнай тэхніцы «пластылінавай перакладкі» (нагадаем, што ў гэтай тэхніцы калісьці здымалі знакамітую «Пластылінавую варону»). Кожны адчуе сябе сапраўдным мультыплікатарам, бо прыдуманы і створаны ім персанаж ажыве на мультстанку. Вядучыя — заснавальніца студыі, аўтар казак, педагог-мультыплікатар Наталля Кулібава, мастачка, педагог-мультыплікатар Вікторыя Хоміч.

А 16.00 у зоне А — «Сярдзітая моладзь: разбор сучаснага фэнтэзі. «Кніга Здольных» С. Аўдзейчык, «Арнаменты» А. Длатоўскай, «Вараціш-гара» М. Латышкевіч. Мадэратарам мерапрыемства выступіць Іван Бачук. А тым часам у зоне В пройдзе супергульня па кнізе Святланы Лаўровай «Трылабіты не вінаватыя». Яе правядуць сапраўдныя магі чытання — магістранты праграмы «Праектаванне праграм у сферы чытання дзяцей і моладзі» МДПУ (Расія). Удзельнікі гэтай імпрэзы (13+) змогуць паразважаць пра шпіёнскі дэтэктыў для дзяцей, хітра схаваны ў гісторыю эвалюцыі, або пра гісторыю эвалюцыі, хітра схаваную ў шпіёнскі дэтэктыў.

І гэта — толькі частка з праграмы фестывалю, які пройдзе з 27 да 28 лістапада. Яшчэ наведвальнікаў чакаюць сустрэчы з п'есай Аляксея Макейчыка «Сорам» (будзе арганізавана чытка Цэнтрам беларускай драматургіі, які стала працуе пры Рэспубліканскім тэатры беларускай драматургіі), спектаклем па матывах кнігі Сары Лундберг «Птушка ўва мне ляціць, куды захоча» (гэты праект прадстаўляе тэатр лялек, святла і ценю «Дом Сонца»), прэзентацыя кнігі Марыі Касцюковіч «Дзіцячы сеанс» (дарэчы, згаданая кніга — першы ў краіне буйны нон-фікшн пра ўсю гісторыю беларускага дзіцячага кіно) і іншыя цікавінкі.

**Сяргей ШЫЧКО.**

Працяг тэмы

# ПАРК НЕВЯДОМАГА ПРЫЗНАЧЭННЯ-2

**Пад такой назвай, толькі без лічбы, у нумары «Звязды» ад 15 верасня быў змешчаны артыкул па звароце магіляўчаніна Юрыя Сязёміна, які скардзіўся на сумны стан парку адпачынку імя 60-годдзя Вялікага Кастрычніка ў Задняпроўі. Хворыя дрэвы, кустоўе, бур'ян, сабакі, якіх тут выгульваюць, — усё гэта мы ўбачылі падчас нашай сумеснай прагулкі па парку. Дарэчы, спартыўная пляцоўка тут хутчэй нагадвае месца адпачынку. Восем лавак, вялікі кветнік і ўсяго некалькі трэнажораў, якія больш падыходзяць для гульняў дзяцей, чым для сур'ёзных заняткаў спортам. На гэта таксама скардзіўся Сязёмін, бо ён трэнер-інструктар і тут рэгулярна праводзіць заняткі з вучнямі. «Тая спартыўная пляцоўка, якая была ў парку раней, больш адпавядала нашым запытам, чым цяпер, але яе чамусьці дэмантавалі», — кажа ён. Мужчына спадзяецца, што з дапамогай газеты атрымаецца яшчэ раз звярнуць увагу мясцовых улад на названыя праблемы.**

У адказе за подпісам **намесніка старшыні Магілёўскага гарвыканкама Алы ГАЛУШКІ** дадзена поўная справаздача ўсяго таго, што плануецца зрабіць, каб выправіць становішча.

Звяртаецца ўвага на тое, што сабакі ў парку — гэта недапушчальна. Існуюць «Правілы ўтрымання хатніх сабак, катоў, а таксама адлову безнаглядных жывёл», якія забараняюць выгульваць там сваіх улюбёнцаў.

«Прадпрыемствам «Магілёўзеленбуд» на тэрыторыі парку неаднаразова ўстанаўліваліся таблічкі з інфармацыяй, што выгул сабак забаронены, але неўстаноўленымі асобамі яны сістэматычна знішчаюцца. Пасля набыцця матэрыялу плануецца зрабіць новыя інфармацыйныя аншлагі і ўсталяваць на тэрыторыі парку», — гаворыцца ў лісце.

Паведамляецца таксама, што ў сувязі з абмежаваным бюджэтам фінансавання, уладкаванне пешаходных дарожак і ўстаноўка новых спартыўных трэнажораў у будучым годзе не прадугледжаны, удакладняецца, што на дадзены момант у парку ўстаноўлены 22 лаўкі і турнікі на спартыўнай пляцоўцы.

Наконт абкошвання травы гаворыцца, што, паколькі плошча парку вялікая — 84 гектары, у першую чаргу ў парадак прыводзяцца тэрыторыі ўздоўж «стыхійна створаных пешаходных дарожак». Пакос астатняй плошчы праводзіцца па меры неабходнасці. Па такім жа прынцыпе праводзяцца работы і па высечцы сухіх дрэў.

Асобна ідзе гаворка пра суседні з паркам вадаём — Грэбянёўскае вадасховішча або, як яго называюць у народзе, Святое возера. Юрыя Сязёміна, як і іншых магіляўчан, вельмі турбуе, што апошнія некалькі гадоў таблічка з надпісам, што купацца ў вадаёме забаронена, не знікае амаль цэлае лета. Тым не менш пляж афіцыйна функцыянуе. «Пры падрыхтоўцы да купальнага сезона выкананы работы па ўстаноўцы малых архітэктурных форм, біяпрыбіральнікаў, зроблена абследаванне і ачыстка дна акваторыі і пляжа ад пабочных прадметаў. Магілёўскім абласным цэнтрам гігіены, эпідэміялогіі і грамадскага здароўя сістэматычна праводзіцца аналіз вады ў возеры. Калі яна не адпавядае нарматывам, вывешваецца інфармацыя аб забароне купання. Пры гэтым пляж не закрываецца, у купальны сезон не ім працуе душ», — гаворыцца ў лісце з гарвыканкама.

Між тым некалі самы папулярны ў горадзе пляж перажывае крызіс. І пра гэта таксама ідзе гаворка ў афіцыйным адказе.

«Што датычыцца экалагічнага стану возера, то, па ацэнцы спецыялістаў Цэнтральнага навукова-даследчага інстытута комплекснага выкарыстання водных рэсурсаў, найбольшую небяспеку ўяўляе забруджванне яго нафтапрадуктамі. Асноўныя забруджвальнікі — прыватны сектар з неарганізаваным бытавым сцёкам, а таксама востраў на акваторыі возера. Падчас аналізу ступені антрапагеннага ўздзеяння на акваторыю возера і прылеглую тэрыторыю вызначаны адпаведныя мерапрыемствы, якія забяспечаць паляпшэнне экалагічнага стану. Яны патрабуюць распрацоўкі праектна-каштарыснай дакументацыі і выдзялення значных фінансавых сродкаў».

Атрымліваецца замкнёнае кола. Уладкаванне парку, і возера патрабуе грошай, якіх няма. Але калі гэты гнайнік не выдаліць, ён можа прарвацца. Калісьці магілёўскія эколагі казалі, што Грэбянёўскае вадасховішча — гэта лёгкія Задняпроўя, у якога пад бокам вялікая прамысловая хімічная зона. Цяпер вадаём хварэе, а хутка, калі нічога не рабіць, пачне, магчыма, і ствараць небяспеку.

**Нэлі ЗІГУЛЯ.**

**Фота з адкрытых крыніц.**



**Калісьці Святое возера было найлепшым месцам для адпачынку магіляўчан.**

Вяртаючыся да надрукаванага

# «Тэрмін будзе вызначаны...»

## Ці паспеюць з рэканструкцыяй храма на Вайсковых могілках у Мінску да 800-годдзя святога Аляксандра Неўскага?



ЗВЯЗДА 14 кастрычніка 2020 г. НАША СПАДЧЫНА 9

ЗАХАВАЦЬ І ГАНАРЫЦЦА

Ці паспеюць з рэканструкцыяй храма на Вайсковых могілках у Мінску да 800-годдзя юбілею святога Аляксандра Неўскага?

**Такім пытаннем задалася карэспандэнт «Звязды», калі рыхтавала артыкул па аднаўленні храма, што пабудаваны больш за 120 гадоў таму ў гонар святога. Матэрыял выйшаў у нумары газеты за 14 кастрычніка пад назвай «Захаваць і ганарыцца». Дарэчы, сам юбілей адбудзецца ў маі 2021 года.**

Нагадаем сутнасць пытання. Цяпер у храме ідуць аднаўленчыя работы за кошт ахвяраванняў вернікаў і розных суб'ектаў гаспадарання. Грошы на гэтыя мэты ахвяравалі «Прамагралізінг», «Мінгаз», «Мінэнерга», сталічныя прадпрыемствы «Слодыч», «Камунарка», «Завод пеністых він» і іншыя. Сапраўды, рэканструкцыя можа доўжыцца гадамі, з кожнага, як кажуць, сабраць па нітцы... Але ж і для горада аб'ект не з ліку шараговых — царква адна з найстарэйшых у Мінску, ды і могілкі, над якімі апякуецца прыход, можна аднесці да катэгорыі нацыянальнага пантэона: тут пахаваны героі-вайскоўцы, выдатныя дзеячы культуры, навукі, прадстаўнікі палітычнай эліты.

— Мы не стаім на месцы, прыцягваем сродкі адкуль магчыма, але для заканчэння рэканструкцыі яшчэ неабходна каля двух мільёнаў рублёў, — тлумачыў тады **кіраўнік апякунскага савета храма Уладзімір ДРАЖЫН.**

Ён сцвярджаў, што паразуменне з уладамі знойдзена: на гэтыя мэты былі запланаваныя сродкі ў інвестпраграме на 2020 год, але ён хутка скончыцца, а грошай дасюль няма. Як высветлілася, Беларускі экзархат не можа выступаць у якасці заказчыка работ, бо ў яго няма адпаведнай службы. Гэтыя функцыі павінна было ўзяць на сябе ўпраўленне капітальнага будаўніцтва Мінгарвыканкама. Здаецца, усё проста — бяры і рабі. Але... год набліжаецца да заканчэння, сродкі могуць застацца неасвоеныя, хваляваўся кіраўнік апякунскага савета.

Атрымліваецца, грошы з боку дзяржавы запланаваны, але пакуль не задзейнічаны ў працэсе рэканструкцыі. Чаго чакаць далей? На гэтае пытанне адказаў «Звяздзе» **першы намеснік старшыні Мінскага гарадскога выканаўчага камітэта Дзмітрый МІКУЛЁНАК.** Цытуем:

«У адпаведнасці з Указам Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь ад 19.12.2019 № 468 «Аб зацвярджэнні Дзяржаўнай інвестыцыйнай праграмы на 2020 год» па аб'екце «Рэканструкцыя храма Аляксандра Неўскага ў г. Мінску» (далей — аб'ект) прадугледжаны долевы ўдзел сродкаў рэспубліканскага і мясцовага бюджэтаў.

Рашэннем Мінскага гарадскога Савета дэпутатаў ад 18.09.2020 № 234 аб'ект уключаны ў інвестыцыйную праграму Мінска на 2020 год па заказчыку УП «УКБ Мінгарвыканкама».

У цяперашні час заказчыкам вядзецца работа па афармленні дазвольнай дакументацыі для будаўніцтва аб'екта.

Тэрмін пачатку правядзення работ на аб'екце і іх завяршэнне будуць вызначаны пасля распрацоўкі праектна-каштарыснай дакументацыі і атрымання дзяржаўнай экспертызы».

**Вольга АНУФРЫЕВА.**

Вопыт

# ДЛЯ САМЫХ МАЛЕНЬКІХ

## Калі гадавалыя дзеці могуць адчуць сябе тэатраламі...

Упершыню ў Гомелі пачаў працаваць бэбі-тэатр. Прэм'ерны спектакль для самых маленькіх гледачоў падрыхтавалі ў лялечным тэатры. Ад сцэнарыя і рэквізіту да сцэнічнага ўвасаблення — усё цалкам выканана камандай відовішчнай установы. Прадстаўленне «Сплюшкі-сплюшкі-тапатушкі» створана такім чынам, што дзеці не проста глядзяць пастаноўку, але і становяцца яе паўнавартаснымі ўдзельнікамі.

— Наша першая гісторыя пра маленькага хлопчыка, які ніяк не хацеў класціся спаць, — зацікаўлівае бацькоў **рэжысёр-пастаноўшчык Гомельскага дзяржаўнага тэатра лялек Валянцін ІЛЬЮКЕВІЧ.** — Дзеткі, якія прыйдуць на наш спектакль, дапамогуць гэта зрабіць разам з нашымі «сплюшкамі», а яшчэ — пагуляюць і патанцуюць.

Усё па-даросламу, інтрыгуюць арганізатары, у якасці тэатральных «праграмак» — аднайменныя са спектаклем кніжкі з вершамі, размалёўкамі і песнямі. Гэта бясплатныя падарункі ўсім маленькім гледачам ад рэжысёра-пастаноўшчыка Валянціны Ільюкевіч, якая з'яўляецца і аўтарам кніжак. Іх мастацкае афармленне — работа мастака бэбі-спектакля Кацярыны Мохаравай.



Дарэчы, першае прадстаўленне для самых маленькіх у лялечным тэатры далі для навучэнцаў Гомельскага каледжа мастацтваў. Такім чынам артысты, рэжысёр і дэкаратар вырашылі падзяліцца вопытам стварэння міні-спектакляў з маладой зменай.

**Наталля КАПРЫЛЕНКА.**

# У прадчуванні свята

## Незвычайнае афармленне навагодняй ёлкі рыхтуюць брэсцкія камунальнікі

**Яна будзе ўстаноўлена на плошчы Леніна. Што з'явіцца побач? Дамкі-церамкі. Іх пакуль што збіраюць у майстэрні і рыхтуюць да афарбоўкі. Пра гэта паведаміў у сваім тэлеграм-канале кіраўнік горада Аляксандр РАГАЧУК.**

А ўсяго ў Брэсце плануюць паставіць 25 ёлак у розных раёнах горада. Галоўная — размесціцца традыцыйна на плошчы Леніна. Напрыклад, у Маскоўскім раёне навагоднія дрэвы ўпрыгожаць на вуліцах Маскоўскай, Гаўрылава, Янкі Купалы, у парку Міру, каля гандлёвага цэнтра «Варшаўскі».

У Ленінскім раёне ў месцах святочных збораў таксама будуць устаноўлены ёлкі. У мікрараёнах — на вуліцах Машэнскага, Дуброўскай, Смірнова, Рэспубліканскай і іншых. Да таго ж сёлета запаляць агні навагоднія прыгажуні ў Гарадскім садзе, на прывакзальнай плошчы станцыі «Брэст-Цэнтральны».

**Святлана ЯСКЕВІЧ.**

**Калектыў Выдавецкага дома «Звязда» выказвае шчырыя спачуванні намесніку дырэктара Юліі Андрэеўне Дашкевіч з прычыны напаткаўшага яе вялікага гора — заўчаснай смерці МУЖА.**

Невядомае пра вядомых

# «І ПРЫВІДЫ КАШТАНАЎ У АКНЕ»

## У Кіеве Уладзімір Караткевіч цудам выратаваўся ад аварыі і двойчы закахаўся

**Горад, «дзе былі помнікі і прыгожыя будынкі, зялёныя бульвары і ціхія хаткі на ўскраінах, дзе быў нават універсітэт, а значыцца, існавала гарластая і хударлявая, дасціпная і яхідная пароda людзей, якіх завуць студэнтамі»... Неаднойчы ў творах Уладзіміра Караткевіча мы трапляем туды.**

**Кіеў... Украіна, з якой у вялікага беларускага рамантыка, які, праўда, не любіў, каб яго называлі рамантыкам, была вялікая лучнасць.**

**Ён любіў і ведаў украінскую літаратуру, ён меў верных украінскіх сяброў, менавіта ў перакладзе на ўкраінскую выйшла ягонае культавае эсэ «Зямля пад белымі крыламі» — перш, чым на беларускай... Вядома, што спрабаваў пісаць вершы на ўкраінскай мове. І ў бронзавым выглядзе ўжо некалькі гадоў стаіць у Кіеве, і каля яго фатаграфуюцца ахвотныя, якіх заўсёды шмат... Я таксама ў свой час збегала да бронзавага свайго настаўніка, на вуліцу Кацюбінскага, і патрымалася за надзейны локаць, сфоткаўшыся хоць так, не патрапіўшы сустрэцца ўжывую... А за спінай у нас з ім гучалі радкі з разгорнутай вялізнай кнігі:**

***«І пад птушак зялёны гоман***
***Нарадзіліся для абшараў***
***Плод кахання бору і хмары —***
***Мой Дняпро, і Бяроза, і Нёман».***

**Давайце напярэдадні юбілею класіка ўспомнім украінскія старонкі яго біяграфіі.**

### Падлеткам Караткевіч трапіў у разбамблены Кіеў і закахаўся

У спадчыне Караткевіча ёсць два найбольш «украінскія» творы: гэта аповесці «Лісце каштанаў» і «У снягах драмае вясна». І хоць апошняя была напісана раней, гісторыя нашага класіка ва Украіне пачынаецца з сюжэта першай...

Гэта вельмі аўтабіяграфічная аповесць. Караткевіч трапіў у Кіеў у 1944 годзе, калі горад толькі вызвалілі ад акупантаў, на Крашчаціку стаяў адзіны ацалелы дом, і паўсюль былі сляды бамбёжак. Тады юны Караткевіч пасля няўдалых уцёкаў на фронт цудам з'яднаўся з бацькамі, але не перастаў рвацца ў бойку.

«Якраз у гэты момант праязджаў праз наш горад мой дзядзька, якога перавялі з Далёкага Усходу на фронт, і ўзяў нас з сабою ў вялікі паўдзённы горад, ад якога немцы адкаціліся куды далей, чым ад Лёзна.

Там у вялізным прасторным двары знайшлася кінутая хата, флігель, што ўвесь тануў у зараслях бэзу. Было цвёрда вядома, што гаспадары загінулі. І мы занялі флігель. І сталі жыць» — так сказана ў аповесці.

У жыцці згаданы дзядзька — гэта муж малодшай матчынай сястры пісьменніка, Яўгеніі Васілеўны, Уладзімір Іванавіч Усюкевіч, якога прызначылі начальнікам штаба чыгуначных войскаў 2-га Украінскага фронту.

Кажуць, дом апісаны дакладна: ён быў на цяперашняй вуліцы Багдана Хмяльніцкага, 52 (былыя назвы Фундуклееўская і Леніна).

У аповесці «Лісце каштанаў» галоўны герой, альтэр эга Караткевіча, беларускі падлетак Васіль, закахаўся ў мясцовую прыгажуню, баявітую Нонку Юніцкую. «*...дзяўчо год пятнаццаці. Схілілася, пачэсваючы вельмі доўгія, падрапаныя ногі шакаладнага колеру, пасля пацёрла каленкам аб каленка, ускінула галаву — чорна-бурыя валасы цяжкай хваляй шыбанулі назад — і ўсміхнулася мне, і я ўбачыў цёмна-сінія вочы з ненатуральна велічэзнымі, па-вар'яцку вясёлымі чорнымі зрэнкамі*».

Даследчыкі сцвярджаюць, што ў гэтай гераіні быў рэальны прататып.

Лёс герояў трагічны: іх падлеткавая дружная каманда трапляе на міны, шукаючы зброю, каб адправіцца на фронт. Выжываюць толькі Нонка і Васіль.

У аповесці Васіль праз шмат гадоў вяртаецца ў Кіеў, адшуквае Нонку і жэніцца з ёю.

У рэальнасці Уладзімір Караткевіч згубіў след свайго юначага кахання, пра якое не аднойчы згадваў у лістах. Праўда, ёсць гіпотэза, што ў Кіеўскі ўніверсітэт ён мог паступіць з разлікам, што знойдзе сваю Нонку...

### Чаму Караткевіча ўзрушвалі кіеўскія каштаны

Аповесць «Лісце каштанаў» пачынаецца з таго, што апавядальнік прызнаецца: ён не любіць тых каштанаў — «візітоўку» Кіева: «*...Нехта можа не паверыць мне, але я і сам не люблю аднаго з самых прыгожых з'яў на зямлі. Не люблю лістоты каштанаў. Жоўтай, асенняй, залацістай пад сонцам, лапчастай (а за ёй сіняе-сіняе неба залатой восені).*

*Прыгажэй за яе няма на зямлі. Вулкі ў залатых каштанах ныраюць то ўгору, то ўніз. Наводдаль цьмяна, як праз ваду, плавяцца ў няяркім сонцы залатыя купалы цэркваў. Лістота звініць, калі яе зграбаюць у купы, у якіх так добра куляцца дзецям і закаханым юнакам. Замілаванне такое, што глянь на ўсё гэта — і памры, бо сэрца разрываецца ад прыгажосці ўвядання*».

Але герою прыгажосць каштанаў нагадвае трагічны выпадак, калі загінулі сябры. А для аўтара аповесці яшчэ і — пра няспраўджанае каханне... І тое, у 1944-м, да невядомай Нонкі, і пра другое, што здарылася пазней, падчас вучобы ў Кіеўскім універсітэце, апісанае ў аповесці «У снягах драмае вясна».

*«Будзь праклятым,*
*юнацтва маё!*
*Будзь праклятым! Каштаны*
*квітнелі вясной,*
*Хаваў нас бэзавы дым.*
*І былі мы з ёю — адно, адно,*
*І ніколі не будзем адным».*
*«Раяль пра нешта*
*дарагое плача*
*І прывіды каштанаў у акне».*

Ну вось урэзаўся ў памяць пісьменніка гэты моцны вобраз — кіеўскія каштаны... І цяпер заўсёды будзе ўражваць чытачоў прыгажосцю, настальгіяй і трывогай.

### У студэнцтве класік ледзь не загінуў на трамваі

«У сорак дзявятым годзе я паступіў у Кіеўскі ўніверсітэт на філалагічны факультэт. Вучыўся, быў шчаслівы, меў шмат сяброў і, усё ж, успамінаю гэты час са змешаным пачуццём глыбокай пяшчоты і сораму. Пяшчоты таму, што была навука, старыя рукапісы, кнігі, музеі, музыка, дзяўчаты, сябры, свае і чужыя вершы. Сораму таму, што нярэдка даводзілася тады сустракацца са звычайнай вульгарызацыяй навукі. Мне хацелася самому зразумець, чаму і нашто, і таму на некаторыя лекцыі я не хадзіў, а замест таго сядзеў у публічнай бібліятэцы».

Аднакурсніца Уладзіміра Караткевіча па Кіеўскім універсітэце, галоўны бібліятэкар Нацыянальнай парламенцкай бібліятэкі Украіны Муза Сняжко ўспамінала: «Любімым месцам Валодзі была Кіева-Пячэрская лаўра. Гэта для яго святая святых: найстаражытная кропка горада і абсалютная даканаласць архітэктуры».

А як ён любіў Дняпро! Той самы Дняпро, які асвяціў і ягоныя праведзеныя на Беларусі гады, які працякае старонкамі эпапеі «Каласы пад сярпом тваім»!

Муза Сняжко згадвае, што студэнтамі яны ўдзельнічалі ў аднаўленні разбомбленага горада. А яшчэ, што Караткевіч з першага курса зацікавіўся кіеўскай старажытнасцю, пешшу абышоў усе славутыя мясціны, наведваў храмы, пра што, вядома, не распавядаў. Не раз адпраўляўся на баржы на вострaў пасярод Дняпра, дзе студэнты ў летнюю сесію любілі рыхтавацца да экзаменаў.

А быў і яшчэ надзвычайны выпадак... Адам Мальдзіс занатаваў, як яны з Караткевічам блукалі па Кіеве каля ўніверсітэцкіх муроў, прыехаўшы на нейкую канферэнцыю.

«Тут Караткевіч стаў згадваць свае студэнцкія гады. Паказаў той трамвайны спуск, дзе ён цудам застаўся ў жывых. Ехаў перад стыпендыяй без білета, і на прыпынку кандуктар высадзіла яго. Ідзе пакрыўджаны і раптам чуе грукат, скрыгатанне металу. Аказваецца, на павароце трамвай сышоў з рэек і з усяго размаху ўрэзаўся ў браму... Успамінаючы пра тую катастрофу, з якой мала хто выйшаў жывым, Валодзя запар выкурыў дзве папяросы і кожны раз, па студэнцкай звычцы, падпальваў запалкай белыя пасмы тапалінага пуху на асфальце».

Гэты выпадак дзіўным чынам перагукваецца з фіналам аповесці «Лісце каштанаў» — там герой, які прыехаў з Беларусі, таксама цудам пазбягае ў Кіеве смерці.



### Ва ўніверсітэце Караткевіч пісаў пра легенды і перажыў здраду

Тая пара, навучанне ва ўніверсітэце, падарыла Караткевічу яшчэ адно ўкраінскае каханне... Даследчык прататыпаў яго гераінь Дзяніс Марціновіч цытуе ліст Караткевіча да сябра Гальперына ад 5 лютага 1957 года: «Я дважды любил взаимно — одна уехала, другая — умерла, и я не знал обеих так, как желал. А в других случаях те, кто любили меня, были мне безразличны, а те, которых любил я, наверное, не любили меня. И была одна в Киеве».

Гэтая «адна» — Святлана, прататып Алёнкі з аповесці «У снягах драмае вясна». Аднакурсніца героя, каханню з якой перашкодзіў зайздрослівы сябар. Герой, Уладзіслаў Берасневіч, не змог паступіць у аспірантуру — з-за таго ж зайздросніка, які наважыўся на паклёп. Уладзіслаў сустракаецца з Алёнкай праз некалькі гадоў, будучы вясковым настаўнікам, каханне ўспыхвае зноў... А што ў жыцці?

Магчыма, знаёмства са згаданай Святланай прыпадае на вясну 1950 года, калі будучаму класіку было ўсяго дзевятнаццаць. Тады і звярнуў увагу на дзяўчыну з «пушыстымі валасамі над чыстым ілбом, міндалевіднымі сінімі вачыма, маленькім прамым носам, трошкі велікаватай ніжняй губкай, тонкай, дзіцячай яшчэ шыяй»; з «агульным выразам чагосьці дзіцячага, нясмелага і, разам з тым, хітрага».

З лістоў Караткевіча вынікае, што з дзяўчынай не зладзілася яшчэ і таму, што калі яму, як і яго герою, не ўдалося паступіць у аспірантуру, строгая маці Святланы палічыла яго нявартым кавалерам.

Дыпломная работа Караткевіча «Казка. Легенда. Паданне», як пішуць, «выклікала неадназначную рэакцыю». На шчасце, знайшліся смелыя выкладчыкі, якія падтрымалі, Караткевіч атрымаў найвышэйшую адзнаку... Але вось у аспірантуру не паступіў. Адам Мальдзіс згадвае ўспаміны аднакурсніка Караткевіча па Кіеве, вядомага польскага паэта і перакладчыка Фларыяна Няўважнага, пра вальнадумства Караткевіча: «У дзень смерці Сталіна ўстроіў у інтэрнаце дэманстрацыйнае застолле. Потым, калі сталі прыпіраць да сцяны не толькі яго, але і сяброў, баронячы іх, выкручваўся: з гора... Караткевіча вельмі любіў і заўсёды бараніў акадэмік Білецкі. Ён хацеў узяць Валодзю ў аспірантуру, нават тэму падабралі пра паўстанне 1863 года ў славянскіх літаратурах. Але будучы «клясык» зрэзаўся на экзаменах на пытанні пра Берыю. Праўда, выпіскі для дысертацыі працягваў рабіць. Потым яны прыдаліся для «Каласоў...».

У аповесці «У снягах драмае вясна» Білецкі выведзены пад прозвішчам Білевіч, а Фларыян Няўважны пазнаецца ў Яне Уважным.

Так што аўтару «Дзікага палявання» давялося адпрацоўваць два гады настаўнікам рускай мовы і літаратуры ў вёсцы Лесавічы Таршчанскага раёна Кіеўскай вобласці.

Вядома, дзяўчыну з заможнай сям'і, якая сур'ёзна займалася музыкай, бацькі не жадалі бачыць жонкай вясковага настаўніка з нявызначаным будучым. «А я обострил со всеми отношения, высек стихами многих начальников из университета. Я не жалею, но не стоили они такой моей жертвы».

Муза Сняжко, аднак, сцвярджае: Караткевіч не разглядаў сваю настаўніцкую працу як прыступку ўніз ці як штосьці непатрэбнае. «Валодзя з любой з'явы жыцця ставіўся з вялікай дапытлівасцю... Ён апісваў сваіх гаспадароў і вучняў у пісьмах, яшчэ і малюнкі досыць выразныя рабіў. А па натуры Караткевіч — вялікі жыццялюб, яго ўсё вельмі цікавіла...»

Даследчык Анатоль Верабей лічыць, што менавіта тады паэт напісаў верш, згадваючы няспраўджанае каханне:

*«Вон он, поезд, в дымке*
*исчезает...*
*От души твоей меня увёз. <...>*
*Расставанье будет невесёлым,*
*Встреча вряд ли*
*будет веселей...*
*Впереди ж пока родные сёла*
*И печаль великая полей».*

І менавіта таямнічай С.М. прысвечаны верш «Размова з Кіева-Пячэрскім сланом», у якім гучыць любоў Караткевіча не толькі да гераіні, але і да цудоўных мясцін:

*У асеннім прысмерку*
*над Дняпром*
*Замігцеў агеньчык сляпы.*
*Ад дажджу пачарнеў*
*небарака-дом*
*І дубоў магутных слупы.*
*Ад дажджоў стаў зялёным*
*стары паркан,*
*Парадзела лісце садоў.*
*Пабяжы на поўдзень,*
*Дняпро-рака,*
*Панясі прывітанне з вадой.*
*Прынясі яго ў горад юнацтва*
*майго,*
*Дзе плылі тапаліныя дні,*
*Дзе чырвоныя паркі*
*ля берагоў,*
*Дзе якраз запалілі агні.*
*Ў гэтым горадзе,*
*дзе златабрамскі сквер*
*Зараз, пэўна, ад ветру пажоўк,*
*Ёсць любімы раён,*
*што завецца «Пячэрск»,*
*Ёсць каштаны ў імжацы*
*дажджоў.*
*Колькі я недакуркаў*
*там раскідаў*
*У начны нечапаны снег,*
*Колькі раз пад вокнамі*
*ноччу стаяў,*
*Каб пабачыць цень у акне.*

Сапраўдная Алёнка-С.М. выйшла замуж за іншага... Уладзімір Караткевіч з'ехаў на Беларусь, дзе яго чакала літаратурная ніва. Але на кіеўскія свае каханні не забыўся ніколі.

### Украінскі раманіст натхняўся творам «Хрыстос прызямліўся ў Гародні»

Прафесар Вячаслаў Рагойша, які разам з калегай і спадарожніцай жыцця Таццянай Кабржыцкай шмат пісаў пра беларуска-ўкраінскія сувязі Уладзіміра Караткевіча, так распавядае пра ўкраінскага пісьменніка Рамана Іванычука: «У час згаданай ужо нашай з Іванычуком ракаўска-іслацкай сустрэчы аўтар «Мальваў» расказаў: толькі што прачытаў у «Нёмане» аповесць Караткевіча «У снягах драмае вясна» — і літаральна быў уражаны падабенствам гэтага твора беларускага пабрацімa да сваёй ранняй аповесці «Прыпыніся, падарожнік!». Тэма, сюжэтныя

# КАШТАНАЎ У АКНЕ...»

хады амаль тыя самыя: студэнцкае жыццё, 1952 г., пярэдадзень смерці Сталіна... Ды і доля падобная абодва творы напаткала: аповесць Караткевіча, напісаная ў 50-я гг., надрукавана толькі ў канцы 80-х; аповесць Іванычука, знятая цэнзурай з друку ў 1966 г., з'явілася ў свет прыблізна ў той самы час...»

Дарэчы, той самы Іванычук успамінаў пра Караткевіча: «Да першай і адзінай сустрэчы, не бачыўшы яго ў вочы і ведаючы толькі па творах і лістах, я лічыўся з Караткевічам як з настаўнікам, хоць былі мы равеснікамі, не пераставаў вучыцца ў яго майстэрству і пасля асабістага знаёмства; я чытаў і перачытваў «Каласы пад сярпом тваім», «Чазеню», «Дзікае паляванне караля Стаха», з тых твораў паўставаў перада мной добры і мудры чалавек, які бясконца любіць сваю Беларусь, яе гісторыю і глыбока шануе маю Украіну, разумеючы і наш боль, і нацыянальны гонар. Для мяне, гістарычнага раманіста, Караткевіч заўсёды быў узорам майстра, які ўмела валодаў і чэсна распараджаўся гістарычным матэрыялам, не раўнуючы як добры гаспадар набытай у поце чала маёмасцю; пад уплывам Караткевічавага рамана «Хрыстос прызямліўся ў Гародні» я напісаў ці не самы ўдалы свой твор «Манускрыпт з вуліцы Рускай», пакарыстаўшыся мастацкімі рэцэптамі беларускага пабраціма».

## Караткевіч і Шаўчэнка

Адам Мальдзіс згадваў, як у Кіеве, калі яны пайшлі дэлегацыяй у музей Тараса Шаўчэнкі, Караткевіч расказваў пра класіка ўкраінскай літаратуры столькі, колькі экскурсаводы расказаць не маглі. А памятаеце, як у «Каласах пад сярпом тваім» князь Алесь Загорскі наведвае санкт-пецярбургскі салон, дзе таемна сустракаюцца будучыя паўстанцы, і бачыць адметнага чалавека:

*«Колькі яму магло быць год? Пэўна, далёка за пяцьдзясят. Ва ўсякім разе, аб гэтым неабвержна сведчылі вельмі сівыя вусы, скляратычны румянец на шчоках і скронях, нос, што калісьці, відаць, быў вастраваты і трошкі задзёрты, а цяпер, з гадамі, абвіс і зрабіўся ўжо нават трохі чырвоны. Дый бровы былі як у старога: кусцістыя, суровыя бровы.*

*Незнаёмы сустрэўся з Алесем вачыма і, відаць, зразумеў, што той разглядае яго як цікавы і загадкавы экзэмпляр роду чалавечага. Вусы варухнуліся, але нават калі б гэтага не было, аб усмешцы можна было б здагадацца па вачах.*

*Вось што маладзіла чалавека: вочы! Залаціста-карыя і, дальбог, пякуча-сінія, як паўдзённае неба.*

*У вачах нейкая пакутлівая вечная думка, якая катавала і нават у хвіліну весялосці не давала палёгкі. Цяжкі, знясілены нейкай неадчэпнай думай, змардаваны і грозны твар.*

*— А таго ты не ведаеш? — спытаў Алесь, збіраючыся ўжо ісці назад у курыльню.*

*— Ведаю.*

*— Хто?*

*— Шаўчэнка».*

Менавіта вялікаму ўкраінскаму паэту Алесь Загорскі ўпершыню чытае свой верш — пра беларускую мову.

*«Гарачыя, сінія цяпер, глядзелі на Алеся вочы. І Алесь раптам адчуў, што яму будзе не сорамна чытаць гэтаму чалавеку нават слабыя радкі, што ён нават хоча чытаць, што падсвядома, яшчэ палову гадзіны назад, марыў аб гэтым...*

*— Ты мой жытні хлеб*
*і каханы май,*
*Песня продкаў,*
*нашчадкаў палі.*
*Без цябе, не з табой —*
*не патрэбен мне рай*
*На душы,*
*Ў небясі,*
*На зямлі».*

Шаўчэнка, паслухаўшы верш, цалуе збянтэжанага Алеся Загорскага ў лоб, як бы блаславяючы на творчасць.

І нельга не заўважыць падабенства гэтай сцэны да знакамітай сустрэчы Пушкіна і Дзяржавіна ў Царскасельскім ліцэі.

Менавіта Шаўчэнка, змагар за нацыянальную мову, перадае эстафету пачынаючаму беларускаму паэту, які таксама мусіць за сваю мову, за незалежнасць свайго народа змагацца. І маладзён Алесь знаходзіць словы, каб суцешыць украінскага генія, які знямагае ў сіле ў салдатчыне.

*«— Вы думаеце, вы канец? —* спытаў Алесь. *— Вы — пачатак. З часам мірыяды людзей сальюцца ў любові да вас, таму што вы нідзе не саступалі, таму што справа ваша — высакародная, таму што такой любові, як ваша, яшчэ пашукаць на зямлі. Такой любові, калі адзін чалавек ратуе цэлы народ».*

## Марыў блукаць па Кіеве вершамі

Прачытала звесткі, што ў Цэнтральным дзяржаўным архіве-музеі літаратуры і мастацтва Украіны захоўваюцца тры сцэнарныя заяўкі на мастацкія фільмы, якія беларускі пісьменнік Уладзімір Караткевіч прапанаваў зрабіць на Кіеўскай кінастудыі імя Даўжэнкі. Шкада, што гэта не здзейснілася... У завяршэнні аповесці «Лісце каштанаў» Уладзімір Караткевіч прыводзіць развагі героя каля помніка Багдану Хмяльніцкаму: *«Багдан узвышаўся нада мною. А я падумаў, што вось пакінуў жа ў Кіеве свой след на гэтай плошчы адзін беларус, скульптар, што зрабіў яго. А можа, пакіну і я? Хаця б тымі вершамі, што я мармытаў і забыў. Шмат год яны будуць лунаць гэтымі завулкамі, нябачныя для вачэй іншых, будуць ціха гучаць у вушах закаханых нават у той нязмерна далёкі час, калі мяне, магчыма, не будзе. І яны, юнакі, будуць прыслухоўвацца да гэтых водгукаў, да водгулля далёкага шчасця і думаць, што гэта ў іхніх душах. А гэта буду я і вершы, забытыя мной дзеля гэтых вуліц і завулкаў. Вечныя вандроўнікі кахання, што блукаюць уначы па гэтай зямлі».*

Караткевіч не памыліўся — ягоныя творы гучаць і ва Украіне... І яго самога там не забыліся... І разам з намі адзначаюць ягоны юбілей.

Калі будзеце ў Кіеве — прыслухайцеся: магчыма, у вулічным шуме, у шолаху лісця каштанаў вы пачуеце водгулле вершаў на беларускай мове, Караткевічавых вечных вандроўнікаў кахання...

**Людміла РУБЛЕЎСКАЯ.**

# Трансфармацыя народнай культуры ў мастацкі авангард

## Адкрылася выстаўка скульптара, работы якога аздабляюць станцыі метро




У Нацыянальным цэнтры сучасных мастацтваў адкрылася выстаўка «Максімалізм». Пад гэтай назвай аб'яднаны работы беларускага скульптара Максіма ПЕТРУЛЯ. Шырокаму гледачу аўтар вядомы дзякуючы супрацоўніцтву з метрапалітэнам: станцыі «Малінаўка» і «Грушаўка» ўпрыгожаны яго творамі. Памятаеце на «Грушаўцы» гэтыя знакамітыя металічныя грушы, якія сімвалізуюць сусветнае дрэва? Мала хто пазбегнуў спакусы сфатаграфавацца каля самай вялізнай ігрушы-ствала... На станцыі новай лініі метро «Плошча Францішка Багушэвіча» ёсць скульптура Максіма Петруля «Кніга беларуская», вытанчаная, шматсэнсавая кампазіцыя, якая імітуе адначасова кнігу і адчыненыя дзверы, акно і кросны і абыгрывае словы Багушэвіча «Не пакідайце ж мовы нашай беларускай, каб не ўмёрлі». Скульптуры Максіма Петруля вядомыя не толькі ў Беларусі, яны выстаўлены ў кітайскіх гарадах Фучжоў, Куньмін, Чанчунь.

Работы скульптара інтэграваны ў асяроддзе, элементы дэкору станцый метро нясуць не толькі дэкаратыўную, а і рэпрэзентатыўную функцыю. То-бок паўсядзённыя для гарадскога жыхара месцы ўспрымаюцца як альтэрнатыўныя выставачныя прасторы.

На пытанне «Звязды», у чым адметнасць выстаўкі, Максім Петруль адказаў так:

— Гэта сцвярджэнне вынайдзенага мною новага напрамку ў мастацтве пад назвай «Максімалізм». Яго сутнасць — у тым, каб мінімальнымі сродкамі мастацкай выразнасці прамовіць аб усім, што хачу, пра важныя, глабальныя рэчы. Я бяру генетычнае цела або матэрыял і трансфармую яго ў канцэптуальны знак.

У работах Петруля філасофскія катэгорыі і панацыі набываюць фізічную абалонку, а плаўнасць і непарыўнасць — іх характэрная рыса.

— Для мастака важна эксперыментаваць і ўзаемадзейнічаць з матэрыяламі. У чым розніца паміж акадэмізмам і фальклорам? У тым, што народнае мастацтва — гэта свайго роду практыкум работы з матэрыяламі: з ніткамі, саломай, лазой. Гэта не традыцыйнае маляванне графітам на паперы. Я ўпэўнены ў тым, што менавіта трансфармацыя народнай культуры ў мастацкі авангард — тое, што найбольш арганічнае для беларусаў. Гэта абумоўлена і нашай генетычнай памяццю, і нашымі традыцыямі.

Наведаць выстаўку можна будзе да 6 снежня ўключна.

**Арына КАРПОВІЧ.**

Дзеля памяці

# Лінія жыцця Валерыя Шкарубы




**19 лістапада 2020 года раптам абарвалася лінія жыцця Валерыя Шкарубы, заслужанага дзеяча мастацтваў Беларусі, лаўрэата Дзяржаўнай прэміі, ганаровага грамадзяніна Мінскай вобласці. У студзені гэтага года ён быў узнагароджаны ордэнам Францыска Скарыны, які ўручаецца «за асаблівыя заслугі ў гуманітарнай, дабрачыннай дзейнасці, поспехі на глебе нацыянальна-дзяржаўнага адраджэння».**

Валерый Шкаруба быў годны гэтай узнагароды. Ён умеў аддаваць. Атрымаўшы за серыю карцін «Спрадвечнае» Дзяржаўную прэмію ў 2002 годзе, на ўсе грошы купіў дзясяткі кніг — дарагіх альбомаў па мастацтве — для бібліятэкі Акадэміі мастацтваў, сваёй almamater. Разумеў, як важна студэнтам-мастакам, асабліва з глыбінкі, у якіх яшчэ няма сродкаў на падарожжы, ведаць сусветныя імёны мастацтва. Найлепшыя карціны Шкарубы знаходзяцца ў галерэі яго роднага Барысава. Барысаўчане нездарма абралі яго ганаровым грамадзянінам горада.

Ён ніколі не сумняваўся ў выбары прафесіі, маляваў з 4 гадоў, калі сям'я жыла ў ваенным гарадку. Пакуль не вылечыўся ад дзіцячага заікання, пазбягаў аднагодкаў, праводзячы час у адзіноце за маляваннем і ў студыі выяўленчага мастацтва Барысаўскага дома піянераў. З дзяцінства любіў працаваць адзін, не любіў пленэры, лічыў, што нічога сур'ёзнага на іх нельга зрабіць. Паступіў у Акадэмію мастацтваў у Мінску на факультэт дызайну і інтэр'ера толькі з чацвёртага разу. Працаваў па спецыяльнасці ў НДІ ЭВМ, але адчуў неадольную цягу да жывапісу. Пачынаў як усе — з кампазіцый і партрэтаў. Але ніколі не працаваў на заказ, не хацеў адчуваць сябе «як у клетцы».

Першую персанальную выстаўку адважыўся зрабіць толькі праз 10 гадоў пасля заканчэння Акадэміі, у 1991 годзе, у 34 гады, калі знайшоў свой вядомы стыль. Многія тады лічылі яго жывапіс дызайнерскім, занадта графічным, або фатаграфічным, называлі «фоташпалерамі». Але ён не рэагаваў на крытыку, упарта гнуў сваё, працаваў, перарываючыся толькі на абед, пазбягаючы залішняй мітусні. Нібы прадчуваў, што дзён яму адмерана няшмат. «Найлепшы дзень — калі ніхто не патэлефанаваў і не прыйшоў у майстэрню, — казаў ён. — Жывапіс нараджаецца ў цішыні».

Музеі яшчэ не куплялі яго твораў. Унучка Марка Шагала Мерэт Меер-Грабер, прыехаўшы ў Мінск, набыла карціну Валерыя для сябе, але, даведаўшыся, што яго жывапісу няма ў Нацыянальным мастацкім музеі, перадала карціну ў дар. Гэта карціна «Белае змярканне» 1991 года паклала пачатак калекцыі з 12 карцін майстра ў НММ РБ.

А ў 2005-м менавіта ён прадставіў Беларусь на першым Венецыянскім біенале. Ён шмат ездзіў на адкрыцці сваіх выставак па запрашэннях галерэй Кітая, Японіі, еўрапейскіх краін, выкарыстоўваючы гэты час для самаадукацыі — наведвання музеяў. У Кітаі яго жывапіс асабліва любілі за блізкае філасофіі будызму ўменне «адлюстраваць нябачнае», магчымасць акунуцца ў транс перад выявамі плыні вады, парываў ветру, снежных раўнін.

Валерый успамінаў, як збянтэжыўся, калі, прыляцеўшы ў Пекінскі аэрапорт, убачыў велізарны чырвоны транспарант, на якім вялікімі літарамі было напісана: «Кітай вітае знакамітага мастака Валерыя Шкарубу!»

Зрэшты, беларуская публіка таксама спаўна ацаніла яго «магічны рэалізм». І інтэлектуалы, і калегі, і людзі, далёкія ад мастацтва. Усіх зачаравалі вытанчанае, амаль рафінаванае майстэрства, стрыманая гама колераў і беларускі дух яго пейзажаў, настрой светлага суму і прасветленасці. Парадаксальна, але кожны пазнаваў свой куток зямлі, думаючы, што Валерый напісаў менавіта яго, прыязджаў на яго радзіму, у яго вёсачку. Хоць яму як мастаку дастаткова было бліжэйшых палёў і азёр, Цнянскага вадасховішча, дачных мясцін вакол Мінска, Браслаўскіх азёр і Слабодкі.

«Я вельмі люблю месцы, якія выклікаюць пачуццё настальгіі», — казаў ён у адным з інтэрв'ю. Яму ўдалося схапіць самую сутнасць, філасофію беларускага пейзажу і настрою — шэры бясконечны дзень, бязлюддзе, пагоркі, першы снег, драўляныя хаты, бясконцыя дарогі, якія ўводзяць у невядомае... Беларусь на яго карцінах — сумная, чароўная невядомая краіна, месца, дзе час спыніўся.

На апошняй персанальнай выстаўцы да 60-годдзя мастака кніга водгукаў хутка распухла ад захопленых слоў, выказаных і ў вершах, і ў цэлых старонках прызнанняў у любові да яго творчасці. Валерый штодня прыходзіў на выстаўку,назіраў за рэакцыяй наведвальнікаў, знаёмых мастакоў. Яго пазнавалі, размаўлялі, задавалі пытанні, фатаграфавалі. Яму было важна ўбачыць зваротную сувязь з гледачом, зразумець, ці на правільным ён шляху. У апошні год жыцця ён публікаваў свае карціны ў сацыяльных сетках, атрымліваючы тысячы захопленых водгукаў.

У 2018—2019 гадах у Гранд-Пале адкрыўся павільён Беларусі для ўдзелу ў найбуйнейшай міжнароднай выстаўцы «Арт-капітал», якая праходзіць штогод пад патранатам прэзідэнта Францыі. У ліку экспанентаў быў і Валерый Шкаруба. Валерыю Фёдаравічу прапанавалі арганізаваць у парыжскай галерэі сваю выстаўку ў 2020 годзе, і ён актыўна рыхтаваўся да яе, практычна не выходзячы з майстэрні, стаўшы пустэльнікам. Ён стаяў ужо на парозе еўрапейскага прызнання. Перашкодзілі пандэмія і раптоўная хвароба...

Карціны Валерыя Шкарубы даўно ўжо прадстаўляюць Беларусь у свеце. У яго «магічных пейзажах» — рысы нашага нацыянальнага менталітэту: спакой, сціпласць, стрыманасць, прастасць народа.

**Надзея УСАВА.**

## РУП «ИНСТИТУТ НЕДВИЖИМОСТИ И ОЦЕНКИ» (Организатор аукциона) извещает о проведении открытого аукциона по продаже имущества, принадлежащего ОАО «БЗПИ» (Продавец)

**Лот № 1:** 1. Пункт техобслуживания погрузчиков, инв. № 610/С-28293, 319,7 кв. м. 2. Электротельфер г/п 2 т Н-6М, инв. № 4153. 3. Таль ручная передвижная червячная, инв. № 4152. Адрес: Минская обл., Борисовский р-н, г. Борисов, ул. Демина, 45.

**Обременения:** пункт техобслуживания погрузчиков с инв. № 610/С-28293 сдается в аренду по 31.08.2023, площадь, сдаваемая в аренду, – 319,7 кв. м.

**Начальная цена с НДС** – 261 920,05 руб.

**Задаток** – 26 192,01 руб.

Земельный участок с кадастровым номером 620850100014000865, 0,3778 га. Право аренды по 06.07.2070. **Штраф** – 25 000,00 руб.

**Лот № 2:** 1. Материальный склад, инв. № 610/С-28311, 640,8 кв. м. 2. Кран-балка г/п 2 т Н-6М, инв. № 4150. 3. Кран-балка г/п 2 т Н-6М, инв. № 4151. Адрес: Минская обл., Борисовский р-н, г. Борисов, ул. Демина, 43.

**Начальная цена с НДС** – 363 756,83 руб.

**Задаток** – 36 375,68 руб.

Земельный участок с кадастровым номером 620850100014000864, 0,4515 га. Право аренды по 06.07.2070. **Штраф** – 35 000,00 руб. Переход права на земельные участки осуществляется в соответствии с действующим законодательством Республики Беларусь.

Аукцион состоится **28.12.2020 в 11.00** по адресу: г. Минск, ул. Комсомольская, д. 11, 3-й этаж, каб. 4.

**Шаг аукциона** – 5 %.

Порядок оформления участия в аукционе, условия аукциона и полный текст извещения содержатся на сайте Организатора аукциона **ino.by.** Задаток перечисляется на р/с BY21BPSB30121543370109330000 в ОАО «БПС-Сбербанк», г. Минск, BIC банка BPSBBY2X. Получатель – РУП «Институт недвижимости и оценки», УНП 190055182.

Окончание приема заявлений с прилагаемыми к ним документами – **23.12.2020 в 11.00**.

**☎ Организатор аукциона:**
**220030, г. Минск, ул. Комсомольская, 11, пом. 9,**
**8 (017) 324-70-57, 8 (029) 356-90-03, 8 (029) 550-09-52**
**• www.ino.by • e-mail: torgi@ino.by**

УНП 190055182

## ОАО «Гомельоблреклама» филиал «Эксперт-Услуга» (организатор аукциона) по поручению Гомельского филиала РУП почтовой связи «Белпочта» (продавец) извещает о проведении 28 декабря 2020 года открытого аукциона по продаже права на заключение договора аренды недвижимого имущества в 11.00 в городе Гомеле по улице Гагарина, 20

| № лота | Наименование лотов | Начальная цена продажи, бел. руб., с учетом НДС (20 %) | Сумма задатка, бел. руб., с учетом НДС (20 %) |
|---|---|---|---|
| 1 | **Помещение площадью 12,8 кв. м** в изолированном помещении – помещение связи с инв. № 350/D-213112, помещение на 4-м этаже. Коэффициент спроса – 3,0. Базовая ставка – 0,2. Коэффициент местоположения – 1.0. **Адрес:** г. Речица, ул. Советская, 66-2 | **57,12** | 5,71 |

| | |
|---|---|
| **Сведения о продавце** | Гомельский филиал РУП «Белпочта», г. Гомель, ул. Советская, 8, тел. 8 (0232) 79-69-76 |
| **Срок подачи заявления** | **С 24.11.2020 г. по 24.12.2020 г.** в рабочие дни с 09.00 до 13.00 и с 14.00 до 16.00 по адресу: г. Гомель, ул. Гагарина, 20, 2-й этаж, каб. «Эксперт-Услуга». Организатор аукциона вправе отказаться от проведения аукциона в любое время, но не позднее чем за 3 (три) календарных дня до его проведения |
| **Номер р/с для перечисления задатка** | BY35 AKBB 3012 0210 2005 4310 0000 в ОАО «АСБ Беларусбанк», BIC AKBBBY2X, УНП 400395996, **получатель – Гомельский филиал РУП почтовой связи «Белпочта»,** назначение платежа – задаток за участие в аукционных торгах за лот № (задаток для участия в аукционе перечисляется до подачи заявления) |
| **Условия пользования** | Для размещения офиса, складских помещений, оказания услуг, организация производства (кроме вредных производств) |
| **Размер штрафа** | Лот № 1 – 1 (одна) базовая величина согласно Указу Президента РБ от 10.01.2013 г. № 14 «О внесении изменений и дополнений в Указ Президента РБ от 05.05.2009 г. № 232» (Об определении размера штрафа в случае отказа или уклонения участника, выигравшего торги, от условий проведения аукционных торгов согласно действующему законодательству) |

**Срок договора аренды – 5 (пять) лет, шаг аукциона – 10 (десять) %.**

**К участию допускаются только индивидуальные предприниматели или юридические лица. Необходимо в адрес Организатора торгов подать заявление по установленной форме, подписать соглашение с Организатором торгов и предоставить необходимые документы:** копию платежного поручения о перечислении задатка на текущий (расчетный) банковский счет, указанный в извещении; юридическим лицом или индивидуальным предпринимателем Республики Беларусь – копию документа, подтверждающего государственную регистрацию этого юридического лица или индивидуального предпринимателя; юридическим лицом нерезидентом Республики Беларусь – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписку из торгового реестра страны учреждения (выписка должна быть произведена не ранее шести месяцев до подачи заявления на участие в аукционе) или иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения; представителем юридического лица или индивидуального предпринимателя предъявляет оригинал доверенности (документ, подтверждающий, полномочия должностного лица). При подаче документов заявитель (его представитель) предъявляет документ, удостоверяющий личность, а руководитель юридического лица – также документ, подтверждающий его полномочия. При заключении договоров аренды ставка арендной платы может быть скорректирована с учетом обязательности применения в соответствии с Указом Президента Республики Беларусь от 29.03.2012 г. № 150 понижающих или повышающих коэффициентов в зависимости от вида деятельности, осуществляемой на арендуемых площадях, и категории арендатора. В случае единственного участника торгов, ему будет предложено приобрести лот по начальной цене, увеличенной на **5 (пять) процентов**. Участник торгов имеет право до начала торгов письменно отозвать свое заявление на участие. Неявка участника торгов на торги признается отказом от участия в торгах. В этих случаях сумма внесенного им задатка возвращается **Продавцом** в течение **5 (пяти) рабочих дней** со дня проведения торгов. Победителями торгов будут признаны участники, предложившие более высокую цену. Победитель аукциона (лицо, приравненное к победителю аукциона) обязан: подписать протокол о результатах аукциона; возместить Организатору аукциона затраты на организацию и проведение торгов, затраты за публикацию в газете «Звязда» в течение **3 (трех) рабочих дней** с момента подписания протокола, а также в установленном порядке перечислить на текущий (расчетный) счет арендодателя сумму, за которую продан предмет аукциона в течение **3 (трех) рабочих дней** со дня его проведения, за вычетом внесенной им суммы задатка. С участником, ставшим победителем аукциона (лицом, приравненным к победителю аукциона) в течение **10 (десяти) рабочих дней** после проведения аукциона и подписания протокола будет заключен договор аренды недвижимого имущества. В срок не позднее **5 (пяти) рабочих дней** после подписания договора аренды победитель торгов обязан подписать акт приема-передачи арендуемого имущества. Аукцион проводится в соответствии с Положением «О порядке проведения аукционов по продаже права заключения договоров аренды капитальных строений (зданий, сооружений), изолированных помещений, машино-мест, их частей, находящихся в государственной собственности, утвержденным постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 08.08.2009 г. № 1049.

**Извещение о проведении аукциона размещено на сайтах: организатора аукциона – www.gomeloblreklama.by, www.expert-usluga.by (раздел «Аукционы»);** Государственного комитета по имуществу Республики Беларусь www.gki.gov.by/ в разделе «Продажа/Аренда имущества», далее – «Продажа и аренда государственной недвижимости. Единая база». **Порядок оформления участия в аукционе, в том числе документации, необходимой для регистрации участника торгов, порядок проведения аукциона размещены на официальном сайте Организатора торгов – www.gomeloblreklama.by, www.expert-usluga.by, раздел «Аукционы».**

**Дополнительная информация по контактным телефонам организатора аукциона: 8 (0232) 23-23-54, 23-23-56, 8 (029) 126-66-62.**

## ИНФОРМАЦИЯ ОБ ОБЪЯВЛЕННОМ ПОВТОРНОМ АУКЦИОНЕ И ПРЕДМЕТЕ ПОВТОРНОГО АУКЦИОНА

**ОРГАНИЗАТОР АУКЦИОНА – КОМИТЕТ ГОСУДАРСТВЕННОГО ИМУЩЕСТВА МИНСКОГО ГОРОДСКОГО ИСПОЛНИТЕЛЬНОГО КОМИТЕТА**

| Дата аукциона | Сведения о предмете аукциона | Местонахождение имущества | Начальная цена, руб. | Информация о публикации извещения |
|---|---|---|---|---|
| **09.12.2020** | Незавершенное незаконсервированное комплексное здание для размещения аварийно-спасательных служб (общая площадь 10 464,6 кв. м, готовность – 25 %) с двумя незавершенными незаконсервированными трансформаторными подстанциями (общая площадь 47,3 кв. м и 46,0 кв. м, готовность – 85 % и 95 % соответственно). Право заключения договора аренды земельного участка площадью 2,2126 га, срок аренды – 5 лет со дня утверждения в установленном порядке протокола о результатах аукциона, либо признании аукциона несостоявшимся | г. Минск, ул. Карвата, 99/16, 99/17, 99/18 | 2 398 602,68 (с понижением начальной цены продажи на 80 %) | Извещение о проведении аукциона опубликовано на https://au.nca.by/item/31504 и https://minsk.gov.by/ru/freepage/other/prodazha_arenda/ |

УНП 100048181

## ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО АУКЦИОНА

### ОАО «Управляющая компания холдинга «ГОРИЗОНТ» проводит повторный открытый аукцион по продаже имущества со снижением цены продажи на 20 %

Повторный аукцион проводится в соответствии с действующим законодательством и Положением ОАО «Управляющая компания холдинга «ГОРИЗОНТ» «О порядке организации и проведения аукционов по продаже капитальных строений (зданий, сооружений), изолированных помещений, машино-мест, их частей»

**ЛОТ № 1**

Капитальное строение с инв. № 500/С-38607, расположенное по адресу: г. Минск, ул. Бабушкина, 60/2. Площадь – 1606 кв. м. Наименование – производственно-складской корпус № 1. Назначение – здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ. Составные части и принадлежности: проезд (Литер а), площадка (Литер б, в, г), подпорная стенка (Литер д), бордюр 0,16 (Литер е), ограждение (Литер ж, и). Обременение: аренда, ипотека. Продавец обязуется снять обременение ипотекой до момента государственной регистрации договора купли-продажи с покупателем.
Земельный участок с кадастровым номером 500000000004005933, площадью 0.6288 га, предоставлен продавцу на праве постоянного пользования, срок действия: не установлен.
На земельном участке установлены следующие ограничения: ограничения (обременения) прав на земельные участки, расположенные в охранных зонах линий связи и радиофикации, площадь 0,0136 га; ограничения (обременения) прав на земельные участки, расположенные в охранных зонах электрических сетей, площадь 0,0100 га; ограничения (обременения) прав на земельные участки, расположенные в охранных зонах сетей и сооружений водоснабжения, площадь 0,1300 га; ограничения (обременения) прав на земельные участки, расположенные в охранных зонах сетей и сооружений канализации, площадь 0,2070 га; ограничения (обременения) прав на земельные участки, расположенные в охранных зонах сетей и сооружений теплоснабжения, площадь 0,0310 га

| | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|
| **Начальная цена (в т. ч. НДС 20 %), BYN** | **1 180 682,31** | **Задаток, BYN** | **118 068,23** | **Шаг аукциона** | **5 %** |

**ЛОТ № 2**

Капитальное строение с инв. № 500/С-38608, расположенное по адресу: г. Минск, ул. Бабушкина, 60. Площадь – 6672 кв. м. Наименование – здание специализированное складов. Назначение – здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ. Составные части и принадлежности: проезд (Литер а), дорожка (Литер б, в), площадка (Литер г, д, е, ж, и, к), бордюр 0,08 (Литер л), бордюр 0,16 (Литер м), ограждение (Литер н, п), ворота (Литер р).
Обременение: аренда, ипотека. Продавец обязуется снять обременение ипотекой до момента государственной регистрации договора купли-продажи с покупателем.
Капитальное строение с инв. № 500/С-38611, расположенное по адресу: г. Минск, ул. Бабушкина, 60/1. Площадь: 11,5 кв. м. Наименование – контрольно-пропускной пункт. Назначение – здание неустановленного назначения.
Капитальное строение с инв. № 500/С-66938, расположенное по адресу: г. Минск, ул. Бабушкина, 60/7. Площадь: 318,3 кв. м. Наименование: гараж. Назначение: здание специализированное автомобильного транспорта. Обременение: аренда.
Лифт грузовой, грузоподъемностью 3,2 тонны; лифт грузовой, грузоподъемностью 3,2 тонны.
Земельный участок с кадастровым номером 500000000004005934, площадью 1,0714 га, предоставлен продавцу на праве постоянного пользования. Срок действия: не установлен.
На земельном участке установлены следующие ограничения: ограничения (обременения) прав на земельные участки, расположенные в охранных зонах линий связи и радиофикации, площадь 0,0272 га; ограничения (обременения) прав на земельные участки, расположенные в охранных зонах электрических сетей, площадь 0,0506 га; ограничения (обременения) прав на земельные участки, расположенные в охранных зонах сетей и сооружений водоснабжения, площадь 0,1640 га; ограничения (обременения) прав на земельные участки, расположенные в охранных зонах сетей и сооружений канализации, площадь 0,2864 га; ограничения (обременения) прав на земельные участки, расположенные в охранных зонах сетей и сооружений теплоснабжения, площадь 0,0400 га

| | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|
| **Начальная цена (в т. ч. НДС 20 %), BYN** | **3 701 962,06** | **Задаток, BYN** | **370 196,21** | **Шаг аукциона** | **5 %** |

**ЛОТ № 3**

Капитальное строение с инв. № 500/С-38609, расположенное по адресу: г. Минск, ул. Бабушкина, 60/3. Площадь – 1063 кв. м. Наименование – склад ядохимикатов. Назначение – здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ. Составные части и принадлежности: проезд (Литер а, б), площадка (Литер в, г, д, е, ж), бордюр 0,16 (Литер и), ограждение (Литер к, л), ворота (Литер м, н). Обременение: аренда, ипотека. Продавец обязуется снять обременение ипотекой до момента государственной регистрации договора купли-продажи с покупателем.
Капитальное строение с инв. № 500/С-38610, расположенное по адресу: г. Минск, ул. Бабушкина, 60/4. Площадь – 1292,5 кв. м. Наименование – здание склада. Назначение – здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ. Обременение: аренда, ипотека. Продавец обязуется снять обременение ипотекой до момента государственной регистрации договора купли-продажи с покупателем.
Капитальное строение с инв. № 500/С-38612, расположенное по адресу: г. Минск, ул. Бабушкина, 60/5. Площадь – 8 кв. м. Наименование – контрольно-пропускной пункт. Назначение – здание неустановленного назначения. Обременение: аренда.
Капитальное строение с инв. № 500/С-66880, расположенное по адресу: г. Минск, ул. Бабушкина, 60/6. Площадь: 2167,4 кв. м. Наименование: навес. Назначение: сооружение специализированное складов, хранилищ. Обременение: аренда.
Кран-балка (грузоподъемностью 1 т. Бабушкина, 60); кран-балка ( грузоподъемностью 2 т. Бабушкина, 60).
Земельный участок с кадастровым номером 500000000004005935, площадью 2,3197 га, предоставлен продавцу на праве постоянного пользования. Срок действия: не установлен.
На земельном участке установлены следующие ограничения: ограничения (обременения) прав на земельные участки, расположенные в охранных зонах электрических сетей, площадь 0,0326 га; ограничения (обременения) прав на земельные участки, расположенные в охранных зонах сетей и сооружений водоснабжения, площадь 0,6892 га; ограничения (обременения) прав на земельные участки, расположенные в охранных зонах сетей и сооружений канализации, площадь 0,3700 га

| | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|
| **Начальная цена (в т. ч. НДС 20 %), BYN** | **1 236 911,74** | **Задаток, BYN** | **123 691,17** | **Шаг аукциона** | **5 %** |

**ЛОТ № 4**

Изолированное помещение с инв.№ 500/D-7113080, расположенное по адресу: г. Минск, пер. Софьи Ковалевской, 52-1. Площадь – 5132,2 кв. м. Наименование – помещение многофункциональное. Назначение – помещение многофункциональное.
Обременение: аренда.
Изолированное помещение входит в состав капитального строения с инв. № 500/С-30416, наименование – А 3/к-кп. Здание блока обслуживания, площадью 6737,5 кв. м, расположенного на земельном участке с кадастровым номером 500000000005000418, площадью 19,9465 га, предоставленного продавцу на праве долевого постоянного пользования. Срок действия: не установлен.
На земельном участке установлены следующие ограничения:
санитарно-защитные полосы водоводов, площадь 2,5940 га; охранная зона магистральных трубопроводов, площадь 1,6738 га

| | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|
| **Начальная цена (в т. ч. НДС 20 %), BYN** | **3 385 696,42** | **Задаток, BYN** | **338 569,64** | **Шаг аукциона** | **5 %** |

| | |
|---|---|
| **Сведения о продавце / организаторе торгов, его местонахождение и контактные телефоны** | ОАО «Управляющая компания холдинга «ГОРИЗОНТ» 220029, г. Минск, ул. Куйбышева, 35, пом. 1. тел. 8 017 284 94 32, факс 8 017 286 76 80 |
| **Сведения о представителях Продавца для осмотра / ознакомления с предметом повторного аукциона** | Ведущий специалист по маркетингу ОАО «Управляющая компания холдинга «ГОРИЗОНТ» Попова Екатерина Владимировна, +375 17 284 94 32, e-mail: arenda@horizont.bn.by |
| **Срок подписания договора купли-продажи** | Договор купли-продажи должен быть заключен в течение **10 (десяти) календарных дней** со дня утверждения протокола о результатах повторного аукциона |
| **Возмещение затрат на организацию и проведение аукциона** | Победитель повторного аукциона или единственный участник повторного аукциона, согласившийся приобрести предмет аукциона по начальной цене, увеличенной на 5 % в течение **5 (пяти) календарных дней** со дня утверждения протокола о результатах повторного аукциона обязан возместить организатору аукциона затраты на его организацию и проведение на основании счета, выставленного организатором аукциона |
| **Условия оплаты** | Оплата задатка производится резидентами в белорусских рублях (нерезидентами в белорусских рублях или в долларах США по курсу НБ РБ на дату оплаты) на следующие банковские реквизиты: р/с BY78 AKBB 3012 0000 3263 3510 0000 в ОАО «АСБ Беларусбанк», код AKBBBY2X, г. Минск, ул. Куйбышева, 18. Получатель – открытое акционерное общество «Управляющая компания холдинга «ГОРИЗОНТ». УНН 101059240, ОКПО 37392696. Если между продавцом и покупателем в течение срока, установленного для заключения договора купли-продажи, не достигнута договоренность по срокам и порядку оплаты объекта, оплата стоимости имущества должна быть произведена в течение 30 (тридцати) календарных дней со дня утверждения протокола о результатах повторного аукциона |
| **Место, дата и время приема заявлений на участие в повторном аукционе** | Заявления на участие в повторном аукционе и необходимые документы принимаются **до 21 декабря 2020 (включительно)** в рабочие дни с 9.00 до 17.00 по адресу: г. Минск, ул. Куйбышева, д. 35 |
| **Место, дата и время проведения повторного аукциона** | Повторный аукцион состоится **24 декабря 2020 года** в 12.00 по адресу: г. Минск, ул.Куйбышева, д. 35, зал совещаний ОАО «Управляющая компания холдинга «ГОРИЗОНТ» |

Организатор повторного аукциона после опубликования извещения о его проведении вправе в любое время без объяснения причин, но не позднее чем за 3 календарных дня до даты проведения повторного аукциона, указанной в извещении о проведении повторного аукциона, отказаться от проведения повторного аукциона

# АБЫДЗЕМСЯ БЕЗ ІХ

## Але як?



**Новая хваля вірусных захворванняў прымушае кожнага задумвацца аб узмацненні імунітэту і стане найважнейшых сістэм свайго арганізма. Ну, а ворагі здароўя сучаснага чалавека (калі казаць аб харчаванні) — цукар і соль, дакладней, іх празмернае ўжыванне. Але ці можна ад іх адмовіцца? І чым іх замяніць?**

### САЛОДКАЕ ЖЫЦЦЁ

Цукар — галоўная «страшылка» сучасных аматараў правільнага харчавання. Звыкламу прадукту праспявалі рэквіем і дыетолагі, і эндакрынолагі, і імунолагі. Наўрад ці сёння хтосьці можа быць не ў курсе, што «белая смерць» спрыяе фарміраванню тлушчавых адкладанняў, зніжае імунітэт, павышае артэрыяльны ціск, пачашчае сэрцабіцце, паскарае працэсы старэння, пагаршае стан скуры, уплывае на дэфіцыт вітаміну В і скачкі глюкозы ў крыві, пагаршае функцыянаванне сардэчнай мышцы. Акрамя таго, цукар выклікае прывыканне, што ў канчатковым выніку прыводзіць да атлусцення, бяссонніцы, пастаяннага пачуцця трывогі і цукровага дыябету.

Вугляводы неабходныя нашаму арганізму як крыніца энергіі для ўсіх тканак, органаў і сістэм, у тым ліку сэрца і мозга. Але патрэбныя менавіта складаныя вугляводы, у той час як многія сучасныя гатовыя прадукты харчавання і паўфабрыкаты прапануюць арганізму простыя, лёгказасваяльныя. Простыя вугляводы максімальна вызвалены ад мінеральных злучэнняў, вітамінаў, цэлюлозы, таму засвойваюцца арганізмам вельмі хутка, лёгка і амаль цалкам. Напрыклад, звыклы нам цукар-пясок, распадаючыся на глюкозу і фруктозу, засвойваецца арганізмам на працягу некалькіх хвілін.

Максімальная колькасць лёгказасваяльных (хуткіх) вугляводаў, якія можна без шкоды для здароўя ўжываць у суткі, — 50 г, кажуць дыетолагі. І сюды ўваходзіць не толькі цукар. «Пустыя» калорыі — гэта і кандытарскія вырабы, і салодкія напоі, і нават несалодкая выпечка з мукі вышэйшага гатунку. Відавочна, што гэты ліміт сучасны чалавек (нават той, хто не з'яўляецца аматарам салодкага) моцна перавышае. Расплата — хваробы сэрца і печані, рэзістэнтнасць да інсуліну. На гэтым фоне страта таліі выглядае найменшым злом...

*СПРАБУЕМ ЗАМЯНІЦЬ*

Ужываць замест цукру адэпты здаровага спосабу жыцця спрабуюць:

• *сухафрукты*. Іх дадаюць у выпечку і запяканкі, п'юць з імі гарбату ўпрыкуску;

• *ягады*. Летам — свежымі, зімой — замарожанымі;

• *садавіну*. Яна спатольвае голад і насычае арганізм вітамінамі, павышаючы імунітэт;



• *мёд*. Гэта ўпадабаны сродак народнай медыцыны, прыродны антыбіётык, акрамя таго, мёд сапраўды салодкі ў адрозненне ад вышэйпералічаных заменнікаў, якія, вядома, салодкія, але ўсё ж не такія, як цукар.

Ну а «спецыяльнай» заменай цукру лічацца модная стэвія і старая добрая фруктоза.

Пару гадоў таму стэвія была такім жа трэндам у дыеталогіі, якім крыху раней — ягады годжы. Атрымліваюць яе з так званай мядовай травы, якую тысячагоддзі вырошчвалі індзейцы Паўднёвай Амерыкі. Стэвіі прыпісваюць мноства станоўчых уласцівасцяў: на хвалі яе папулярнасці пісалі нават, што яна здольная спыняць развіццё ракавых клетак. Стэвія зніжае ўзровень цукру ў крыві, нармалізуе артэрыяльны ціск, пазбаўляе ад карыесу і запаленчых працэсаў у ротавай поласці, утрымлівае вітаміны A, E, C і групы B, цынк, магній, фосфар, руцін, кальцый, селен, медзь, хром, калій. А салодкасці ў лісціках гэтага экзатычнага нізкарослага травяністага куста змяшчаецца ў 15 разоў больш, чым у цукры. Праўда, асалода прыходзіць нязвыкла павольна — спачатку вам доўга не салодка. Затое, калі становіцца салодка, гэтая слодыч адчуваецца даўжэй, чым слодыч звычайнага цукру. Адным словам, адразу прывыкнуць да спецыфічнага смаку стэвіі складана.

Каларыйнасць стэвіі — 18 ккал на 100 г. Дыетолагі называюць яе самым бяспечным заменнікам цукру. Але маюць на ўвазе ў першую чаргу сушанае лісце «мядовай травы», а не экстракты прамысловай вытворчасці. Суцэльнае або здробненае лісце прадаецца ў буйных супермаркетах, крамах здаровага харчавання або інтэрнэт-крамах. З лісця заварваецца настой, які дадаецца ў гарбату, каву, дэсерты. Ці ёсць мінусы ў «мядовай травы»? Некаторыя дыетолагі выказваюць меркаванне, што рэгулярнае ўжыванне стэвіі можа спрыяць зніжэнню палавой функцыі арганізма. Ну і, зразумела, як практычна любы прадукт расліннага паходжання, стэвія можа выклікаць алергію.

Фруктозу атрымліваюць з ягад і садавіны. Яе прынята лічыць дыетычным прадуктам, але на самай справе фруктоза неверагодна каларыйная. Калі дзесяцігоддзі таму, на світанку дыеталогіі, спецыялісты раілі ўжываць фруктозу замест цукру, меркавалася, што паколькі яна ў два разы саладзейшая за цукар, чалавек будзе ўжываць яе ў меншых дозах. Але чалавечая псіхіка такая, што калі мы прывыклі класці ў каву дзве лыжкі цукру, то і фруктозы пакладзём стольki ж. І такім чынам толькі павялічым утрыманне цукру ў арганізме. Каштоўнасць фруктозы — не ў яе каларыйнасці, а ў тым, што фруктозу могуць ужываць нават дыябетыкі: распад гэтага прадукту адбываецца так хутка, што не падвяргае арганізм людзей, якія пакутуюць на цукровы дыябет, небяспецы.

### І Ў ГЭТЫМ СОЛЬ

Соль для сучаснага чалавека — гэта агранка любога смаку. Без солі ўсё прэснае і мае невыразны смак. Наогул соль, а дакладней хлор і натрый, вельмі патрэбная чалавечаму арганізму. Соль падтрымлівае неабходны аб'ём крыві, стабілізуе абмен рэчываў, хлор незаменны для сінтэзу страўнікавага соку, а без натрыю не працуюць нервовыя клеткі і не скарачаюцца мышцы. Калі з рацыёну цалкам выключыць соль, мы атрымаем слабасць мышцаў, сутаргі, спазмы страўніка і парушэнне работы кішэчніка, пагаршэнне памяці, зніжэнне артэрыяльнага ціску, сухасць скуры і г. д. Але сучаснаму чалавеку недахоп солі не пагражае, нават калі ён наогул перастане саліць сваю ежу. Праблема ў тым, што ў нашы дні, нават імкнучыся скарачаць колькасць солі, вы ўсё роўна, хутчэй за ўсё, спажываеце яе значна больш дзённай нормы. Стагоддзі таму соль была рэдкасцю, дарагой прыправай. Сёння дыетолагі кажуць аб сур'ёзнай праблеме лішку солі ў рацыёне. Бо вельмі многія гатовыя прадукты — кансерваваныя, вяленыя і вэнджаныя вырабы прамысловай вытворчасці, паўфабрыкаты і фастфуд — утрымліваюць вялікую колькасць солі. Паводле апошніх даследаванняў, сучасныя жыхары буйных гарадоў у апошнія гады дэманструюць паніжэнне адчувальнасці да солі ў ежы. І, як следства, спажываюць солі ўсё больш і больш. А на перавышэнне нормы наш арганізм адказвае ацёкамі твару і канечнасцяў, зніжэннем працаздольнасці нырак, пастаяннай смагай, павышэннем унутрычарапнога і артэрыяльнага ціску, парушэннем работы нервовай сістэмы.



Сусветная арганізацыя аховы здароўя называе дакладную лічбу — не больш за 5 г солі ў суткі. Сюды ўваходзіць і так званая прыхаваная соль — у хлебе, сырах, вэнджанай і салёнай рыбе, каўбасах, соусах прамысловай вытворчасці і г. д.

*СПРАБУЕМ ЗАМЯНІЦЬ*

Соль замяніць больш складана, чым цукар. Але таксама магчыма.

• *Ламінарыя, яна ж марская капуста*. У якасці заменніка солі яе выкарыстоўваюць у сухім здробненым выглядзе. Набыць сухую ламінарыю можна ў аптэцы, а перад ужываннем здрабніць у кавамолцы або ў ступцы. Перасаліць прадукт з дапамогай ламінарыі складана, але злёгку саланаватымі ваш суп або салата стане. Плюс карысць для здароўя (пра яе напісана столькі, што не будзем паўтарацца). Праўда, ламінарыя мае лёгкі ўласны смак, які не кожнаму падабаецца. Норма ўжывання парашку ламінарыі ў суткі — не больш за палову чайнай лыжкі. Існуюць супрацьпаказанні — туберкулёз, цяжарнасць, скурныя захворванні, парушэнні работы нырак і некаторыя іншыя.

• *Сельдэрэй*. Фаварыт аматараў фітнесу змяшчае натрый у сваім складзе, і гэта забяспечвае яму салёны смак. У цёплы сезон у стравы дадаюць свежае лісце салеры, на зіму рэкамендуецца сушыць і здрабняць сушаную салеру. Дадаваць здробнены сельдэрэй раяць за дзве хвіліны да завяршэння гатавання стравы або «саліць» з яго дапамогай страву парцыённа, што найлепш, бо так захоўваюцца ўсе вітаміны і мінералы. Салера змяшчае вітаміны A, $B_6$, C, K, E і PP, дапамагае арганізму выводзіць таксіны і ўмацоўвае імунітэт.

• *Сумесі траў і высушанай, здробненай гародніны*. Салёнай страву яны не зробяць, але дапамогуць «адцягнуць увагу» ад адсутнасці солі. Розныя кухні правільнага харчавання прапануюць спалучаць паміж сабой у розных прапорцыях імбір, перац чылі і папрыку, цыбулю, часнок, корань хрэну. Сумесь траў для замены солі — базілік, кмен, эстрагон, каляндра, пятрушка, зіра, размарын, чорны і чырвоны перац. У салаты разам з гэтымі сумесямі можна дадаваць лімонны сок — кіслата таксама кампенсуе недахоп солі.

### КАЛІ ПАДМАН НЕ АТРЫМАЕЦЦА

Спробы падмануць смакавыя рэцэптары прыводзяць да пераядання, адзначаюць дыетолагі. Паколькі нізкакаларыйныя дэсерты без цукру не насычаюць, яны правакуюць з'есці іх пабольш. Вынік — «расцягнуты» страўнік і ўсё тая ж лішняя вага. Заменнікі солі ў ежы, у сваю чаргу, могуць справакаваць жаданне махнуць рукой на правільнае харчаванне і ад душы пасаліць мяса або суп. Самы дзейсны шлях скарачэння спажывання цукру і солі — гэта памяншэнне іх у рацыёне натуральным шляхам: праз сілу волі, не звяртаючыся да заменнікаў. Харчовыя звычкі змяніць складана, але магчыма. У сярэднім, адзначаюць спецыялісты правільнага харчавання, для гэтага патрэбны рашучасць і 3-4 тыдні. Прыкладна за такі тэрмін рэцэптары прывыкнуць да новых смакаў, а паляпшэнне самаадчування стане ўзнагародай за ўпартасць і стымулам не здавацца.

**Аляксандра АНЦЭЛЕВІЧ.**

Тэма

# Як прakласці сцежкі да музеяў?

## Новыя трэнды



**Вы заўважылі, як за апошнія дзесяцігоддзі моцна змянiўся музейны свет? Як хутка мы адышлі ад традыцыйнага сузірання экспанатаў і абмену ўражаннямі паўшэптам. Сёння музейная прастора становіцца месцам для сустрэч з цікавымі асобамі, імпрэз, прэзентацый, міні-спектакляў, дыялогаў, пазнавальных лекцый вучоных.**
**Тут нават ладзяцца вяселлі і выпускныя, забаўляльныя праграмы, квэсты.**

Аднаўленыя сядзібы спрыяюць вяртанню імёнаў славутых землякоў і наогул працуюць на нашу самаідэнтыфікацыю. Нараджаюцца новыя формы работы з наведвальнікамі. Усё тое, што па-моднаму называецца інтэрактывам, насамрэч дазваляе гасцям музея паглыбіцца ў гісторыю. У Дукорскім маёнтку мы можам назіраць за работай рамеснікаў. У Суле — цэлым комплексе міні-музеяў (іх тут ажно 25) — пазнаёміцца з рознымі бакамі гісторыі і побыту нашых продкаў: за адзін дзень, праведзены тут, вы здолееце пабываць у сярэднявечнай школе, развучыце з аніматарамі старадаўнія танцы, пазнаёміцеся са старажытнымі інструментамі, убачыце стаянку першабытнага чалавека і нават праплывяце на ладдзі вікінгаў.

Гэтай восенню музейны комплекс «Дудуткі» ладзіць маштабны праект «Легендарныя эпохі», калі кожныя выхадныя ствараецца антураж пэўнага гістарычнага перыяду дзякуючы выступленням рэканструктарскіх клубаў, пастановачным паядынкам, музыкам і рамеснікам, лекцыям гісторыкаў і этнографаў.

Рэканструктарскія клубы актыўна ўдзельнічаюць у праграмах музея «Лінія Сталіна».

Актыўна задзейнічаны і прылеглы ландшафт. Пасля знаёмства з інфармацыяй пра род Агінскіх у Залессі госці з задавальненнем гуляюць па парку, катаюцца на конях... Дарэчы, падчас пандэміі менавіта такія музеі з прылеглай зялёнай тэрыторыяй сталі карыстацца асаблівым попытам. Уласна менавіта каранавірус асабліва востра ўзняў пытанне пра тое, што трэба зрабіць установам культуры, каб утрымацца на плаве.



Канешне, на пандэмію можна глядзець як на сур'ёзны выклік — яна абмежавала магчымасці для падарожжаў, зрабіла людзей больш асцярожнымі, прымусіла сядзець дома. Але ў той жа час яна паскорыла многія працэсы, якія ўжо адбываліся. І справа не толькі ў трывалым уваходзе лічбавых тэхналогій у сферы нашага жыцця, кліпавае мысленне і паскарэнне тэмпаў жыцця. Адбываюцца і змены ў свядомасці. Пасля працяглых абмежаванняў і нават «зняволення» на каранцін ва ўсім свеце пачаў расці попыт на зносіны. Мы хочам вярнуць парушаныя сувязі, давер, узаемаразуменне. І ўстановы культуры маглі б паспрыяць у гэтым вяртанні ў зону камфорту. Пандэмія — не час для таго, каб згортваць праграмы, наадварот, можна назіраць, колькі інавацый з'явілася апошнім часам. Маленькім музеям гэта лета нават падарыла новых наведвальнікаў — людзі ў пошуках бяспекі сталі часцей выязджаць за межы вялікіх гарадоў.

Не трэба забывацца і пра наладжванне сувязяў у віртуальным свеце, пасля пандэміі анлайн-сябры могуць наведаць установу.

Музеі аблічбоўваюць свае калекцыі. Установы культуры праз інтэрнэт прапаноўваюць далучыцца да віртуальных праектаў. Да таго ж каранавірус даў моцны імпульс для абмену вопытам, знаёмства з напрацоўкамі калег з розных куткоў свету. Сёння можна не толькі пабываць на віртуальных экскурсіях у заморскіх музеях, але і слухаць на «Ютубе» і ў «Зуме» публічныя лекцыі, семінары, знаёміцца з перадавымі тэхналогіямі, разам шчыраваць над інавацыямі.

Сёння мы паспрабуем зазірнуць у будучыню і ўбачыць, як музеі і наогул установы культуры будуць развівацца пасля каранакрызісу.

---

Трансфармацыя

# СХОВІШЧА РАРЫТЭТАЎ ЦІ МЕСЦА СУСТРЭЧЫ?

**Сёння музеі ўсяго свету спрабуюць знайсці адказ на пытанне, як выстройваць сваю работу, калі будучае цьмянае? Ужо сёння зразумела, што давядзецца ствараць новыя праграмы і прадукты, а магчыма, і кардынальна змяняць свае падыходы. У посткаранавірусны час, калі людзі адчуюць сябе ў бяспецы, яны захочуць нечага радаснага, аптымістычнага, новых знаёмстваў і адкрыццяў. Музеі і наогул установы культуры маглі б скарыстаць такую патрэбу. Уласна, адна з новых роляў гэтых інстытуцый можа быць ў тым, каб аднавіць узаемадзеянне і давер паміж людзьмі.**

### САЦЫЯЛЬНАЯ ПЛЯЦОЎКА

Музей — гэта прастора, дзе можна на нейкі час забыцца на штодзённыя клопаты. Некаторыя з іх дораць цеплыню, пачуццё ўтульнасці, нібы ты знаходзішся дома. А для асобных катэгорый гэта яшчэ і месца для сацыяльнай тэрапіі. Вы заўважылі, як актыўна ў апошнія гады грамадскія арганізацыі, што працуюць з людзьмі, якія маюць пэўныя праблемы са здароўем, стараюцца завабіць сваіх падапечных у музеі і тэатры? Дарэчы, гэта адзін з сусветных трэндаў, калі музеі ў супрацоўніцтве з грамадскімі арганізацыямі і прадстаўнікамі аховы здароўя распрацоўваюць спецыяльныя праекты для людзей з інваліднасцю (хваробамі нервовай сістэмы, з дэменцыяй і г. д.). У пэўных выпадках медыкі нават прапісваюць паход у музей як лекі. Сталыя людзі, калі дакранаюцца да культуры і гісторыі, захапляюцца, далучаюцца да дыялогу, вяртаюцца да жыцця, і важна, каб такія сустрэчы не былі адзінкавымі. Каб гэтыя людзі не адчувалі сябе выключанымі з грамадства, неабходна ствараць спецыяльныя праграмы, якія паспрыяюць вяртанню ў музеі па веды і станоўчыя эмоцыі. Але інклюзія — гэта толькі адзін са шляхоў прыцягнення ва ўстановы новай аўдыторыі.

Устойлівае будучае — за супрацоўніцтвам розных інстытуцый. Культура і мастацтва павінны стаць неад'емнай часткай выхавання дзяцей. Ужо сёння некаторыя беларускія музеі праводзяць для хлопчыкаў і дзяўчынак не толькі экскурсіі, але і майстар-класы, інтэрактыўныя праграмы. У Беларускім дзяржаўным музеі гісторыі Вялікай Айчыннай вайны распрацаваны шэраг музейных заняткаў. Для вучняў старэйшых класаў супрацоўнікі праводзяць праз інтэрнэт урокі па тэмах, якія дзеці праходзяць у школе.

Нават у час пандэміі можна пашыраць ахоп аўдыторыі, умацоўваць адносіны, калі выкарыстаць для сувязі інтэрнэт. Натуральна, «лічба» не можа цалкам замяніць рэальнасць, але яна дае новыя магчымасці. Зацікаўленыя асобы нават у аддаленых кутках Беларусі атрымліваюць доступ да кантэнту, напрыклад, пэўнага сталічнага музея. Праз інтэрнэт можна падняць новыя тэмы, прыцягнуць валанцёраў, партнёраў, запусціць краўдфандынг для новых праектаў, знайсці аўдыторыю для сумеснай работы. Напрыклад, віртуальныя сябры могуць стаць аўтарамі кантэнту для музейных інтэрнэт-рэсурсаў, дасылаючы фатаграфіі і інфармацыю пра цікавыя рарытэты, што захоўваюцца ў сям'і, запісваючы фальклорныя творы і ўспаміны, звязаныя з нейкімі гістарычнымі падзеямі.

Людзям патрэбныя зносіны, і таму важна данесці да грамадскасці, што музеі таксама могуць стаць прасторай для сустрэч. Тэматычныя выстаўкі, прэзентацыі, імпрэзы — таму пацвярджэнне. Усё больш актыўна пачынаюць выкарыстоўвацца і тэрыторыі, што прылягаюць да музеяў. Узаемадзеянне з аўдыторыяй — вельмі важны складнік. Сёння музеі стараюцца прапаноўваць адкрытыя інтэрактыўныя пляцоўкі, дзе наведвальнікі могуць падзяліцца асабістымі гісторыямі, сваімі поглядамі. Апошнім часам у свеце пачало актыўна развівацца музейнае валанцёрства. Добраахвотнікі дапамагаюць рабіць разнастайныя праекты, прыводзяць новую аўдыторыю, ствараюць свежы кантэнт. Напрыклад, у сацыяльных сетках яны могуць расказваць пра любімыя экспанаты альбо запісваць гісторыі ад сведкаў Халакосту, якія сыходзяць з жыцця, і важна паспець як мага больш запісаць, бо менавіта жывая гісторыя, якую расказаў рэальны чалавек, — найлепшае пацвярджэнне, каб падобнае не паўтарылася.

Лічбавыя інструменты дазваляюць ствараць багата новых інфармацыйных прадуктаў, таму важна падключаць да гэтага работнікаў культуры, мастакоў, вучоных, ствараць спрыяльнае асяроддзе для навучання і сумеснага росту і развіцця.

### ПЕРАЗАГРУЗКА

Музеі назапашваюць веды, як працаваць з рознымі групамі насельніцтва, з рознымі аб'ектамі, тэмамі. Носьбіты культуры, захавальнікі спадчыны, яны здольныя данесці інфармацыю аб тым, хто мы як грамадства, якія ў нас карані, традыцыі, памкненні.

Паступова ва ўсім свеце музеі становяцца пляцоўкай для дыялогу, яны дапамагаюць аб'ядноўваць грамадства. Важна сачыць за тым, якія змены адбываюцца вакол нас, як той жа каранавірус паўплываў на наша жыццё, як яго змяняюць новыя тэхналогіі. Музеі ўсяго свету пачалі збіраць артэфакты бягучых дэманстрацый, наступстваў эканамічнага крызісу. Такім чынам яны фарміруюць калекцыю для будучага, каб пасля чалавецтва магло адрэфлексаваць, вывучыць і гэтыя старонкі гісторыі. Такім чынам музей становіцца інструментам, што дапамагае грамадству даследаваць сябе, асэнсоўваць новыя мадэлі развіцця, шукаць шляхі адаптацыі да змен.

І не варта лічыць, што музей — з'ява кансерватыўная. Вы заўважылі, як мяняецца падача інфармацыі, вядзецца пошук інавацыйных падыходаў у адносінах да калекцый, іх інтэрпрэтацыі? Музеі не з'яўляюцца асобнымі астраўкамі, яны павінны быць упісаныя ў культуру, сістэму адукацыі і нават у жыццё і рытм горада. Свет змяняецца, у аўдыторыі з'яўляюцца новыя патрэбы, расце цікавасць да лакальных асаблівасцяў, гісторыі.

Сёння мала рабіць стаўкі толькі на турыстаў. У часы каранавіруса можна адчуць, наколькі неабходна для музеяў увага мясцовай супольнасці, асабліва ўстановам у невялікіх гарадах. Каб наладзіць сесёння ўзаемаадносіны з аўдыторыяй, важна падумаць аб тым, чым музеі будуць карысныя менавіта для мясцовага насельніцтва, як яны могуць быць інтэграваныя ў працэсы развіцця горада. Напрыклад, можна арганізаваць хаб для рамеснікаў і мастакоў на лакальным узроўні. Альбо наладзіць супрацоўніцтва з дамамі культуры ці нават мясцовымі фермерамі, якія гатовыя прадаваць свае прадукты падчас сумесных праграм.

Аб'ядноўваючы намаганні, музеі здольныя зрабіць жыццё пэўнай мясцовасці больш цікавым, насычаным, да таго ж яна стане магнітам для турыстаў. Трэба ўвесь час шукаць шляхі таго, як паслужыць жыхарам горада, як уцягнуць мясцовую публіку ў сваю работу. Гэта могуць быць не толькі праграмы для школьнікаў, але і, напрыклад, майстар-класы па рукадзеллі,варкшопы, ініцыятывы па рабоце з моладдзю і людзьмі сталага веку. А ўзровень даверу да невялікіх музеяў сярод публікі можа быць даволі высокі. Па сутнасці, яны становяцца лабараторыямі, якія напрацоўваюць вопыт, што пасля можа аказацца карысны і для больш буйных устаноў.

Трэба думаць і пра тое, чым нашы музеі могуць быць цікавыя свету, бо з пераходам у лічбавую прастору іх кантэнт можна будзе пагледзець з любой кропкі свету. Таму трэба ўважліва сачыць за якасцю інфармацыі, якую вы выкладваеце ў сеціва. Не трэба гнацца за яе колькасцю. Нашмат важнейшая ўнікальнасць артэфактаў, гісторый і ідэй.

**Алена ДЗЯДЗЮЛЯ.**

Залатыя рукі

# Гістарычныя рэбусы тканых акварэляў

## Выстаўка майстрыхі Алены ШУНЕЙКІ ў Гродне: знаёмства з габеленамі і майстар-класы

**Гэты год для майстра па ткацтве Алены Феліксаўны Шунейкі ўдвая юбілейны. Знакамітая мастачка ў красавіку адсвяткавала 70-годдзе.**
**А родны для яе Гродзенскі абласны метадычны цэнтр народнай творчасці, дзе Алена Феліксаўна працуе ўсё жыццё, у снежні адзначыць 80!**
**Дзве святочныя даты сталі важкай нагодай для адкрыцця персанальнай выстаўкі ўнікальнага майстра «Мой любы горад», наведаць якую ў метадычным цэнтры можна ўжо сёння.**

### БАЦЬКАВА СПАДЧЫНА — ВЫТОК ТВОРЧАСЦІ

Калі да работы ставіцца з любоўю, яна адразу перастае быць цяжкай, перакanana Алена Шунейка. Ёй у жыцці выпала рэдкая ўдача — прафесійна займацца справай, якая прыносіць бясконцую асалоду і найвялікшае задавальненне. Кажуць, што такая лёсавызначальная ўсмешка фартуны дастаецца толькі людзям з вялікім сэрцам, якія сапраўды яе заслужылі...

Тварыць з душой, захапляць сюжэтамі і вобразамі, прыкмячаць у наваколлі багатую колеравую палітру — усе гэтыя ўменні майстрыха атрымала ў спадчыну ад бацькі. Галоўны ж бацькаў скарб — адзіны ў Беларусі вертыкальны ткацкі станок. Менавіта Фелікс Антонавіч у сярэдзіне мінулага стагоддзя заснаваў у метадычным цэнтры творчую ткацкую лабараторыю, якая на працягу ўжо амаль 40 гадоў з'яўляецца для яго таленавітай дачкі адначасова і рабочым кабінетам, і ўтульнай майстэрняй, і нават другім родным домам.

Экспазіцыя выстаўкі «Мой любы горад» налічвае каля 50 аўтарскіх работ, сярод якіх разнастайныя тканыя габелены, дэкаратыўныя пано і акварэльныя карціны. Трэба сказаць, што гэта далёка не поўная калекцыя твораў Алены Феліксаўны. Палотны майстрыхі сёння ўпрыгожваюць інтэр'еры храмаў, дыпламатычных прадстаўніцтваў, з'яўляюцца каштоўнымі экспанатамі музеяў. Патомная ткачыха вельмі ганарыцца сваім габеленам «Святая Тройца», які ў якасці харугвы выкарыстоўваецца падчас святочнай працэсіі ў сталічным касцёле Святога Роха.



Алена ШУНЕЙКА і пераемніца яе таленту Юлія БАРАДЗІНА.

Некаторыя творы Алены Шунейкі знайшлі свае месца далёка за межамі Беларусі: у Польшчы, Расіі, Францыі і Эстоніі. Бацькава тэхніка падвойнага і пераборнага аднабаковага ткацтва, якой валодае майстрыха, унесена ў Дзяржаўны спіс гісторыка-культурных каштоўнасцяў Рэспублікі Беларусь.

### ГАБЕЛЕНЫ — ГІСТОРЫЯ, НАМАЛЯВАНАЯ НІТКАМІ

Крыніца натхнення для Алены Феліксаўны — родны горад Гродна з яго архітэктурнымі жамчужынамі і прыродай, якая зачароўвае. Пра гэта сведчыць і красамоўная назва выстаўкі. Алена Шунейка — бадай, адзіная ў вобласці майстрыха, якая настолькі дасканала валодае ўсімі «таямніцамі» габеленавай ніткі, што здолела віртуозна перадаць у творчасці нават энергетыку старажытных гродзенскіх храмаў! Вытканыя Фарны і Бернардзінскі касцёлы яна па-мастацку ўдала аздобіла вобразнымі выявамі Святога Духа. Наогул, кожнае палатно — гэта цэлая гісторыя, напоўненая глыбокім ідэйным зместам, філасофскімі рэбусамі і творчай фантазіяй. Па прызнанні Алены Феліксаўны, тканыя акварэлі, напэўна, не былі б такія цэласныя і гарманічныя, каб у іх стварэнні не ўдзельнічаў яе брат, мастацтвазнавец Яўген Шунейка. Менавіта ён малюе эксклюзіўныя эскізы для габеленаў. У творчым тандэме ствараюцца неверагодныя рэчы: у жывых вобразах паўстае гістарычнае мінулае Гродна, сустракаюцца знакавыя постаці з розных эпох, адраджаецца Фара Вітаўта, Маці-радзіма набывае жаночае аблічча, а сярод велічных будынкаў вымалёўваецца родны дом майстрыхі...

Кожны наведвальнік выстаўкі «Мой любы горад» можа і палюбавацца экспанатамі, і самастойна папрацаваць за ткацкім станком. Майстар-клас для ўсіх ахвотных з задавальненнем прапануе Алена Феліксаўна і яе здольная вучаніца Юлія Барадзіна. Дарэчы, работы маладой пераемніцы, метадыста цэнтра народнай творчасці, сталі несумненным упрыгожваннем экспазіцыі. Падвойныя габелены, народныя лялькі, ажурныя карункі — рукатворныя цуды, вытканыя нашай сучасніцай па старажытных узорах, уражваюць і крануюць за жывое.

### ЭНЕРГІЯ — У ПРЫРОДЗЕ

Пачэснае месца на выстаўцы займаюць акварэльныя карціны Алены Шунейкі, напісаныя ў тэхніцы «a la prima». Усе без выключэння работы — пленэрныя, пісаліся мастачкай у момант асаблівага ўражання, на хвалі натхнення. Стварэць «жывыя» акварэльныя замалёўкі з натуры — гэта таксама ўлюбёны занятак творчай сям'і Шунейкаў. Нёман, кветкі, лес, Калюжа — знаёмыя з маленства мясціны знайшлі сваё адлюстраванне на жывапісных палотнах. Кожная работа носіць глыбока асабісты характар, вабіць асаблівай колеравай вобразнасцю, выявай шчырай творчай душы...

Наведвальнікаў выстаўкі «Мой любы горад» чакае не толькі знаёмства з цікавымі экспанатамі. Кожная работа майстра — гэта своеасаблівы... аўтапартрэт, углядаючыся ў які, можна выразна ўбачыць цэлую палітру пачуццяў, пашану да сямейных традыцый і роднага краю. Алена Шунейка — гродзенскі чалавек-легенда, які літаральна дыхае творчасцю. І ў кожным яе творы бруіць жыццё...

**Ала БЯЛЬКЕВІЧ, рэдактар ДУК «Гродзенскі абласны метадычны цэнтр народнай творчасці».**

Таямніцы сталіцы

# ПРА ШТО РАСКАЖУЦЬ КАМЯНІ?



**Як за некалькі гадзін прайсці ўсю Беларусь, пабываць на Мінскім моры і на Нарачы, патрапіць на беразе Нёмана і Заходняй Дзвіны, забрацца на Ашмянскае і Навагрудскае ўзвышшы? Для гэтага трэба толькі наведаць самы незвычайны музей Мінска, што знаходзіцца ва Уруччы.**

Тут размешчана самая вялікая карта Беларусі, яна выкладзена камянямі. Прычым паказаны не толькі межы краіны, але і асноўныя формы рэльефу, сцежкі імітуюць галоўныя рэкі, вадаёмы. Адзін ваш крок тут будзе роўны прыкладна двум кіламетрам.

Па гэтай карце можна чытаць і дзе «спыняліся» апошнія ледавікі — межы паказаны ланцужкамі з невялікіх валуноў. Размешчаны камяні згодна з геаграфічным прынцыпам.

Помнік прыроды рэспубліканскага значэння «Парк камянёў» займае плошчу больш за сем гектараў. На жаль, гэты ўнікальны не толькі для Беларусі, але і для ўсёй Еўропы (дзе няма «каменных» музеяў такіх маштабаў і з падобнымі ідэямі) аб'ект пакуль застаецца не раскручаны. Сёння сталічныя экскурсаводы спрабуюць выправіць такую недарэчнасць і найперш знаёмяць з гэтым аб'ектам жыхароў, што жывуць побач з незвычайным музеем.

Па звезеных сюды з усёй Беларусі экспанатах можна чытаць гісторыю нашай краіны, прычым перанесціся на ўяўнай «машыне часу» на мільёны гадоў назад.

Сучасны выгляд паверхні зямлі, на якой мы жывём, звязаны з яе развіццём за апошнія два мільёны гадоў. 1760 тысяч гадоў таму тэрыторыя ўяўляла сабой раўніну, якая павышалася з захаду на ўсход. У музеі камянёў можна даведацца, як на нашы землі ледавікі наступалі са Скандынаўскага паўвострава і пяць разоў пакрывалі тэрыторыю Беларусі. Самым магутным было Дняпроўскае зледзяненне, якое, як мяркуюць вучоныя, адбылося 350—280 тысяч гадоў таму. У тыя часы ледавік пакрываў усю тэрыторыю нашай краіны.

А вось Сожскае зледзяненне ахапіла толькі палову тэрыторыі. Падчас свайго панавання гэты ледавік «збудаваў» Гарадзенскае, Ваўкавыскае, Слонімскае, Навагрудскае, Капыльскае, Ашмянскае, Мінскае і Аршанскае ўзвышшы. Менавіта гэты і апошні — Паазерскі — ледавікі пакінулі на нашай тэрыторыі вялікую колькасць валуноў.

Калі вы будзеце гуляць па парку, звярніце ўвагу, як на жывой карце ўзгоркі, аздобленыя камянямі, мяжуюць з роўнай і чыстай паверхняй. Толькі людзям, якія мала падарожнічалі па сваёй краіне, можа здавацца, што яна паўсюль аднолькавая. Калі палешукі прыязджаюць на Міншчыну, ім, што прывыклі да жыцця на раўніне, тутэйшы рэльеф можа падацца няўручным. Проста да іх не дайшоў ледавік, які пашырараваў на тэрыторыі цэнтральнай і паўночнай Беларусі.

На поўдні краіны камянёў вельмі мала, небагата іх і на ўсходзе. А вось на захадзе такога багацця аж занадта. Напрыклад, Смаргонскі раён працэнтаў на 40 «засеяны» камянямі, што ставарае праблемы для сельскай гаспадаркі. Ледніковая спадчына ўплывала на гісторыю і культуру. Згадайце, колькі замкаў з каменя было на захадзе — тое ж Крэва. А на ўсходзе такога будаўнічага матэрыялу не хапала, цэгла была дарагая, а драўляныя пабудовы не дажылі да нашых часоў.

Асобныя экспазіцыі ў музеі пад адкрытым небам прысвечаны форме і структуры камянёў. Даследчыкі па іх могуць вызначаць, адкуль і якім чынам прыбылі на нашы землі гэтыя «госці». Асобныя камяні ў целе ледавіка падчас падарожжа траплялі ў расколіны, збіваліся, сціраліся, растрэскваліся, станавіліся гладкімі, а іншым удалося праехацца «верхам», яны да сёння нагадваюць кавалак скалы. Дарэчы, адзін з самых буйных такіх вось «абломкаў» спачывае каля Ракава на трасе, як ехаць на Гродна і ён з'яўляецца помнікам прыроды.

На каменнай карце яўна не хапае шыльды, прысвечанай аўтарам ідэі аб стварэнні музея валуноў, яна павінна з'явіцца там, дзе выкладзена тэрыторыя Магілёўшчыны, Мсціслаўскі раён, дзе ў вёсцы Малая Багацькаўка нарадзіліся браты Максім і Гаўрыла Гарэцкія. Першы стаў пісьменнікам, другі — геолагам. Гаўрыла, як і Максім, прайшоў праз рэпрэсіі 30-х гадоў, цудам змог выжыць, хоць яму і быў вынесены смяротны прысуд, і ў 60-х гадах вярнуцца на радзіму, стаць ганаровым акадэмікам НАН Беларусі, зрабіць шэраг навуковых адкрыццяў.

Не ўсе ідэі, якія прагучалі яшчэ ў 80-я гады, у музеі былі рэалізаваныя. Тут планавалася яшчэ паставіць скульптуру мамантa: у Мінску багата знойдзена парэштках гэтых жывёл: напрыклад, пры будаўніцтве станцыі метро «Барысаўскі тракт», на «Аўтазаводскай» і нават калі капалі катлаван пад узвядзенне Палаца Рэспублікі. Дарэчы, пабачыць косткі мамантаў можна ў Геалагічным музеі, што знаходзіцца побач з паркам камянёў. Ён размешчаны ў будынку Навукова-практычнага цэнтра па геалогіі. Музей створаны на базе калекцыі Інстытута геахіміі і геафізікі НАН Беларусі, РУП «Белгеалогія» і Рэспубліканскага ўнітарнага прадпрыемства «Беларускі навукова-даследчы геолагаразведачны інстытут». Яшчэ тут размешчаны ўзоры мінералаў і горных парод з розных краін і кантынентаў, а таксама з дна чатырох акіянаў. Палеанталагічная калекцыя ўключае косткі жывёл, якія вымерлі, адбіткі і акамянеласці старажытных рыб, раслін, шыкоўная калекцыя метэарытаў.

Але вернемся ў музей валуноў пад адкрытым небам. Асобная яго экспазіцыя распавядае пра камень у жыцці чалавека. Тут вы ўбачыце валуны з малюнкамі і надпісамі, аб'екты, якім пакланяліся нашы продкі, напрыклад знакаміты камень «Дзед», да якога яшчэ ў мінулым стагоддзі людзі хадзілі, каб пазбавіцца ад хвароб і няшчасцяў. Ён ляжаў на беразе Свіслачы. Сёння на тым месцы размешчана таблічка, што гэта помнік гісторыі. Па адной з версій, тут было апошняе паганскае капішча на тэрыторыі Еўропы. Нехта Севасцей праводзіў тут службы, рытуалы, рабіў для жанчын свісткі (мауляў, калі ў іх свістаць, муж, якога забралі на вайну, павінен вярнуцца). Хоць экскурсавод Цімох Акудовіч лічыць гэтага Севасцея тагачасным «стартаперам», людзі да каменя і так хадзілі, прыносілі ахвяры, а чалавек вырашыў гэта ўжыць на сваю карысць і проста прапанаваў пэўны «комплекс паслуг», на чым нядрэнна зарабляў. Святыню раскідалі ў 1905 годзе.

Ахвяры да каменя носяць і ў наш час. Калі-нікалі вы можаце пабачыць на валуне цукеркі ці манеткі. Увесну дзяўчаты-этнографы нават аднавілі старадаўні абрад: за ноч саткані ручнік, аб'ехалі з ім вакол горада, а пасля павязалі на камень «Дзед». У даўніну нашы продкі такім чынам спрабавалі спыніць эпідэміі.

Таксама ў экспазіцыі вы пабачыце камяні-следавікі — адбіткі на іх па старых павер'ях пакінула Божая Маці. Маўляў, некалі яна басанож хадзіла па зямлі, а камяні тады былі яшчэ мяккія. Вада ў адбітках лічылася гаючай. Ёсць тут і памежныя камяні (іх клалі, каб пазначыць свае надзелы), каменныя жорны XVIII—XIX стагоддзяў, і крыж з выявай рыцара ў кароне і літарамі RSB (верагодна, надпіс расшыфроўваецца як «Кароль Стэфан Баторый»). Ляжаў тут раней і яшчэ адзін незвычайны экспанат, які па форме нагадваў жаночую фігуру. Гэты каменны ідал быў перанесены ў Геалагічны музей. Там жа захоўваюцца і барэльефы, на якіх паказаны народныя паданні, звязаныя з камянямі. Планавалася, што яны будуць размешчаны на алеі з вялікіх валуноў з больш роўнымі краямі. Так, нашы продкі верылі, што ў камянях жывуць чорт, змей, цмок альбо што ў іх ператвораны людзі. Напрыклад, у Беларусі асобныя групы камянёў спрадвеку завуцца «Быкі», ці «Аратыя». Быццам яны так пакараныя Богам за работу на Вялікдзень ці ў нядзелю альбо за скнарнасць.

**Алена ДЗЯДЗЮЛЯ.**

Центр Промышленной Оценки
• Организация аукционов
• Оценка всех видов имущества

# ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО АУКЦИОНА

| | |
|---|---|
| **Организатор аукциона** | **ЗАО «Центр промышленной оценки», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703** |
| **Продавец** | **ОАО «Белинвестбанк», г. Минск, пр-т Машерова, 29** |
| **Предмет аукциона Недвижимое имущество, реализуемое одним лотом, в следующем составе:** | |
| **- двухэтажное кирпичное административное здание банка** (здание административно-хозяйственное), общ. пл. **733,4 кв. м**, инв. № **100/С-45868**, по адресу: **г. Брест, ул. Веры Хоружей, 8А;**<br>**- гараж** (здание специализированное автомобильного транспорта) общ. пл. 79,8 кв. м, инв. номер 100/С-45856, по адресу: г. Брест, ул. Веры Хоружей, 8А/1. Составные части и принадлежности: пристройка | |
| **Начальная цена с НДС 20 % – 911 880,00 бел. руб.** | |
| **Сведения о земельном участке с кадастровым номером 140100000001005764:** предоставлен на праве постоянного пользования для обслуживания и эксплуатации здания общей площадью 0,1203 га.<br>**Дополнительная информация:** при приобретении предмета аукциона, победитель аукциона или единственный участник аукциона заключает с Продавцом договор купли-продажи имущества, относящегося к предмету аукциона, на сумму 12 720,00 бел. руб. с НДС 20 %. Состав имущества и цены размещены на сайте организатора торгов www.cpo.by | |
| **Задаток 10 %** от начальной цены предмета аукциона перечисляется на р/с BY60BLBB30120191021390001001 в Дирекции ОАО «Белинвестбанк» по г. Минску и Минской области (адрес банка: г. Минск, ул. Коллекторная, 11), БИК BLBBBY2X, УНП 191021390, получатель платежа – ЗАО «Центр промышленной оценки» | |
| **Срок заключения договора купли-продажи: 20** календарных дней после проведения аукциона | |
| **Условия оплаты предмета аукциона:** победитель аукциона или единственный участник аукциона, согласившийся приобрести предмет аукциона по начальной цене, увеличенной на 5 % (далее – единственный участник аукциона), обязан произвести оплату в размере 100 % стоимости имущества не позднее **30** календарных дней с момента заключения договора купли-продажи | |
